…ЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

…іцебскі …ралетары

…ВЕННАЯ ГАЗЭТА ГАРКОМУ КП(б)Б, ГАРСАВЕТУ І ГАРПРАФСАВЕТУ.

КОШТ НУМАРУ Ў ГОРАДЗЕ І РАЁНАХ 5 кап.

РЭДАКЦЫЯ: Палац працы, 3-ці паверх, пак. 39, 40, 41, 43. Тэлеф. агульны . 2-85, „ рэдактара 1-73, „ сэкрат. і к-ры . . 72.

Падпісная цана ў месяц: Для рабочых, служачых і калгасьнікаў . . — р. 80 к. Для ўстаноў . . . . 1 „ — „ З дадаткам „Чырвоная Беларусь": Для рабочых, служачых і калгасьнікаў. . . 1 „ — „ Для ўстаноў . . . 1 „ 20 „

Плата за абвесткі: За радок петыту . . . 30 кап. Для іншагародніх . . . 40 „ Пры шматразовым друкаваньні сьціжка ад 30 да 50 проц.

ГОД ВЫДАНЬНЯ 14-ты.

№ 164 | Панядзелак, 27 ліпеня 1931 г. | № 164

30 ліпеня, а 18 гадз., у Палацу працу, пакой № 11 склікаецца ПЛЕНУМ ГАРСАВЕТУ

На абвестцы дню:
1. Даклад аб становішчы камунальнай гаспадаркі гораду.
2. Даклад мандатнай камісіі.
Яўка ўсіх членаў і кандыдатаў гарсавету абавязкова. Павінен таксама зьявіцца актыў гарсавету, вольны ў гэты час ад працы на вытворчасьці.

…жніўня — Міжнародны чырвоны дзень

…ніўня—дзень агляду сіл …га рэвалюцыйнага ру- … пралетарскага адпору міжнароднай буржуазіі …ктоўцы новай імпэрыялі- …вайны і асабліва інтэр- …проць СССР.

…м годзе 1-га жніўня бу- …одзіцца ў абстаноўцы …вастрэньня сусьветнага …капіталізму. Эканаміч- …с перайшоў у новую … пачаўся крызіс крэды- …ансаў, банкруцтва і крах …яржаў. Лопаюцца буй- …прадпрыемствы і банкі …ыне, Вэнгры. На краі …аходзіцца таксама Поль- …ынія і інш. Веснавое … ажыўленьне ў гаспа- … гэтым годзе не прывя- …да якога паляпшэньня …чага становішча ў ка- …чных краінах. Беспра- …тастрафічнымі тэмпамі …. У выніку новага абва- … крызісу, новыя сотні …бочых выкідваюцца на … галодную сьмерць.

…чная Амэрыка — гэта …якую апартуністы і мен- …раслаўлялі, як край рос- …ма корчыцца ў судара- …ызісу. У баязьні перад …ыяй амэрыканскі прэзы- …сунуў новы плян выра- … капіталістычнай Эўро- … голаду. Гэты плян у … чаргу азначае новыя … для рабочых і народных …меччыны.

…рызьня паміж капіталі- …якая разгарнулася вакол …Гувэра, яскрава паказвае …ырашымы клубок супя- …цый, у якіх знаходзіцца …зм.

…зіва таму, што небясьпе- …й і асабліва антысавец- …йны, ніколі яшчэ ня бы- … блізка, як зараз. „Кожны …лі капіталістычныя супя- …ці пачынаюць абвастрац- …жуазія накіроўвае свае … ў бок СССР—ці нельга …ць тую ці іншую супя- …ць капіталізму, альбо ўсе супярэчнасьці, разам узятыя, на конт СССР—гэтай цытадэлі рэвалюцыі, якая рэвалюцыянізуе адным сваім існаваньнем рабочую клясу і каленіі, якая перашкаджае наладзіць новую вайну, якая перашкаджае перадзяліць сьвет па-новаму, якая перашкаджае гаспадарыць на сваім вялізарным унутраным рынку" (Сталін, даклад на 16-м зьезьдзе партыі).

У гэтых умовах 1 жніўня будзе знаменным днём у справе падрыхтоўкі рабочае клясы і яе саюзьнікаў да канчатковых боек за зьвяржэньне капіталізму.

Буржуазія па-свойму рыхтуецца да гэтага дню. Яна мабілізуе ўвесь свой апарат гвалту і ашуканства. У Польшчы праведзены масавыя арышты. Турмы перапоўнены рэвалюцыйнымі рабочымі і сялянамі. У Нямеччыне мы наглядаем шалёнае цкаваньне кампартыі. Сацыял-паліцэйскімі падрыхтоўваецца поўная забарона кампартыі. Забаронена «Ротэ Фанэ» — цэнтральны орган нямецкіх камуністаў. Аднак, гэтая новая хваля тэрору прадстаўляе галоўную небясьпеку для самай буржуазіі, бо яна яшчэ больш рэвалюцыянізуе масы, штурхае іх да рашучых боек.

Паводле прызнаньня саміх капіталістаў, 1 жніўня будзе праходзіць у абстаноўцы, вельмі падобнай да 1923 г. Розьніца тая, што зараз рэвалюцыйны ўздым пачынаецца і ў Польшчы, што зараз мы маем вялізарнае ўзмацненьне магутнасьці Савецкага саюзу.

Буржуазія шукае контр-рэвалюцыйнага выхаду з крызісу. Пралетарыят становіцца на шлях рэвалюцыі.

Доўгам кожнага працоўнага Савецкага саюзу зьяўляецца ўзмацненьне сваіх намаганьняў у барацьбе за выкананьне плянаў сацыялістычнага будаўніцтва, за ўзмацненьне Чырвонай арміі і абароназдольнасьці краіны саветаў.

…распаўсюджваньні ЦО „Праўда"

Пастанова сэкратарыяту гаркому КП(б)Б ад 21-га ліпеня

…кратарыят гаркому КП(б)Б …туе—нягледзячы на тое, … боку гаркому КП(б)Б ме- …рэктывы па распаўсюд- …ю ЦО „Праўда", на …шні дзень у Віцебску … глыбокі тыражны пра- …амест 7000 экз. выпісваец- …00 экз. Партыйныя і праф- …зацыі не аддалі належнай …а распаўсюджваньню ЦО …. Партыйная частка …ыемстваў і ўстаноў неда- …ва ахоплена падпіскай на … «Праўда».

…кратарыят гаркому КП(б)Б …чае штурмавы 6-дзёньнік …ліпеня па 1 жніўня па лік- …і тыражнага прарыву ЦО …а».

…бавязаць ячэйкі і калек- … КП(б)Б, фракцыі ФЗМК …а абвясьціць аб штурме …кія масы працоўных прад- …стваў і ўстаноў, сканцэн- …ўшы ўвагу вакол выканань- …перавыкананьня дадзеных …ольна-тыражных лічбаў пад …гам: «Дамо ЦО «Праўда» … падпішчыкаў з 1-га жніў-…

…Прапануецца ўсім партка- …вам і ячэйкам КП(б)Б вы- …ь цэхарганізатараў па …ўсюджваньню ЦО „Праўда". …Ня менш аднаго разу ў ме- … заслухоўваць партупаўна- …нага па друку на бюро …кі і калектывах, практычна …агаючы ім у рабоце.

…Парткалектывам і ячэйкам …)Б праверыць ахоп партый- … кандыдатаў партыі газэ- …„Праўда", дабіўшыся ў час 6-дзёньніка 100-проц. ахопу іх падпішчыкамі.

7. Газэце „Віц. Пралетары" асьвяціць ход штурму па прадпрыемствах падпіскі на газэту «Праўда», скарыстаўшы рабкораў-дэлегатаў 2-га ўсебеларускага зьезду, якія абвясьцілі сябе падпішчыкамі на «Праўда», з тым, каб апошнія прынялі актыўны ўдзел у пашырэньні шэрагаў падпішчыкаў на „Праўду".

8. Прапанаваць райспажыўсаюзу і райкалгассаюзу ўключыцца ў 6-дзёньнік штурму. Райспажыўсаюзу ўзмацніць прыём падпіскі і продажу ў розьніцу праз сельпо.

9. Адзначыць зусім нездавальняючае распаўсюджваньне ЦО «Праўда» на чыгунцы, парткалектывы і ячэйкі чыгункі ігнаруюць пытаньне распаўсюджваньня „Праўды".

Прапанаваць парткалектывам і ячэйкам чыгункі ў час 6-дзёньніка штурму дабіцца рашучага пералому па распаўсюджваньню і 100-проц. выкананьня тыражна-кантрольных лічбаў.

Прапанаваць т.т. Якушонку і Маскалёву распрацаваць канкрэтныя мерапрыемствы па распаўсюджваньню друку на чыгунцы.

Даручыць т. Зелянкоўскаму прасачыць за правядзеньнем усіх гэтых мерапрыемстваў у жыцьцё.

Не пазьней 15-га жніўня заслухаць на сэкратарыяце гаркому КП(б)Б аб ходзе падпіскі на ЦО «Праўда».

Другая пяцігодка сельскай гаспадаркі

…СКВА, 25. НКЗем СССР пры- …апярэдныя наметкі другога пя- …вага пляну сельскай гаспадар- …одна пляну пасеўная плошча …на быць даведзена да 190—200 … га. Сельска-гаспадарчая пра- …ыя будзе падвоена, прычым па- …эньне валавой прадукцыі зярна …ае, прыкладна, 60 проц., пра- …ыя жывёлагадоўлі павялічваец- … два з паловай разы і прадук- …эхнічных культур па меншай …—у тры разы.

… сельска гаспадарчая вытвор- …ць будзе пабудавана на сацыя- …чных пачатках. Калгасная гас- …рка будзе будавацца на грунце …ынна-трактарных станцый. Коль- …ць трактараў будзе складаць 15—16 млн. конскіх сіл. Пачынаючы з 1933 г. мэханізуецца ўся вытворчасьць тэхнічных культур. Сельская гаспадарка ўключаецца ў агульную сетку электраперадач, прычым на яго долю прыйдзецца каля 25 млрд. кілават-гадзін у год.—ад 10 да 15% агульнай прадукцыйнасьці электрычных станцый.

У другую пяцігодку неабходна забясьпечыць павялічэньне спажываньня мяса і малака ў 2—3 разы супроць цяперашняга, давесьці спажываньне мяса да 45—50 клгр. (у горадзе да 62) і малочных прадуктаў да 300—350 кілё на чалавека ў год. У першыя два гады пяцігодкі павінна быць цалкам ліквідавана 3-польле.

НІВОДНАГА РАБОЧАГА КАЛГАСЬНІКА, АДНААСОБНІКА БЕЗ ПАЗЫКІ „3-га рашаючага году 5-годкі"

К 1-му ЖНІЎНЯ ЗАКОНЧЫЦЬ РЭАЛІЗАЦЫЮ ПАЗЫКІ НА ВЁСЦЫ

Да 1-га жніўня засталося 4 дні

Трывожныя лічбы

Пазыка „Трэці рашаючы год пяцігодкі" у горадзе рэалізавана к 25 ліпеня на 106,3 проц., а ў вёсцы на 66 проц. Ня гледзячы на тое, што па гораду маецца перавыкананьне кантрольнай лічбы, усё-ж становішча з рэалізацыяй пазыкі на радзе прадпрыемстваў і нават на некаторых буйнейшых зьяўляецца зусім нездавальняючым. **Падпіснай ахоплены ня ўсе 100 проц. рабочых і служачых і не на поўны іх месячны аклад.** Вось прыклады: на фабрыцы „Сьцяг індустрыялізацыі" з **3348** рабочых пры месячным заробку ў **329 000 р.** падпісалася на пазыку **3035** на суму 277.125 руб. На заводзе «Чырвоны мэталіст», дзе працуе **1110** чал., падпісалася **994** на суму **87.695 р.** пры месячным заробку ў **135 000 р.**

На фабрыцы «Дзьвіна» з 2193 рабочых ахоплены падпіскай 1.822 на 75.065 р. пры месячнай зарплаце ў 114.141 р. **Панчошная фабрыка** пры месячнай зарплаце ў **183.500 р.** рэалізавала пазыку толькі на **136405 р.**, з **3415** рабочых ахоплены падпіскай 2830 і зусім ганебнае зьявішча мы маем на біофабрыцы, дзе з 57 рабочых з месячнай зарплатай у 5460 р. падпісалася на пазыку 55 **і на агульную суму 1350 руб.**

Гэтыя факты кажуць аб тым, што партыйныя і прафсаюзныя арганізацыі і камісіі садзейнічаньня не разгарнулі растлумачальнай працы аб 100-проц. ахопу усіх рабочых пазыкай і ня менш месячнага заробку. Зусім нездавальняючае становішча з рэалізацыяй пазыкі мы маем на вёсцы, дзе шэраг сельсаветаў ганебна адстае і асабліва па рэалізацыі пазыкі сярод аднаасобнікаў. Напрыклад, **Руднянскі** сельсавет павінен быў рэалізаваць сярод аднаасобнікаў пазыку на **10600** руб.—на 25 ліпеня рэалізавана на... **120 рублёў; Бараўлянскі** сельсавет, які павінен быў рэалізаваць пазыку сярод аднаасобнікаў на 5515 р., нічога не рэалізаваў. **Бабініцкі** сельсавет пры заданьні ў 6480 р. рэалізаваў пазыку... на 15 р., **Сялюцкі** сельсавет рэалізаваў на 500 р. сярод аднаасобнікаў, замест прадугледжаных 8305 руб. **Рудакоўскі** сельсавет—13680 р., рэалізаваў на 920 р., **Старасельскі** 5920 р.—рэалізаваў на 185 р., **Ялагінскі**—6975 р., рэалізаваў на 895 р., **Даўжанскі** сельсавет—4615 р., рэалізаваў 985 р., **Лётчанскі** с.-с.—10665 р.—рэалізаваў 1895 р., **Міхалеўскі** сельсавет—11025 р., рэалізаваў на 1000 р., **Шумянскі** сельсавет—4140 р., рэалізаваў на 950 руб. Заданьне па рэалізацыі пазыкі па сацыялістычным сэктары ў некаторых сельсаветах выканана за выключэньнем Старасельскага і Бабініцкага, а паасобныя сельсаветы па сацыялістычным сэктары перавыканалі заданьне. Напрыклад: Даўжанскі сельсавет замест 6750 р. рэалізаваў пазыку на 8195 р., Міхалёўскі—2770 р.—6000 руб, Віцебскі — 4500 р.—8000 р.

Усе гэтыя зьвесткі кажуць аб тым, што асабліва па індывідуальным сэктары мы маем вялікі прарыў у галіне распаўсюджваньня пазыкі, калі з агульнага заданьня ў **95 680 р.** выканана на 25 ліпеня толькі на **11.965 р.**

Гэта абавязвае нас павесьці вялікую растлумачальную працу і разгарнуць сапраўдныя ўдарныя тэмпы работы і да 1-га **жніўня дабіцца поўнага выкананьня і перавыкананьня заданьня, ахапіўшы падпіскай на пазыку ўсіх калгасьнікаў і аднаасобнікаў.**

Н. Д.

Прадпрыемствы—шэфы, на дапамогу вёсцы ў рэалізацыі пазыкі

Пастанова бюро гаркому КП(б)Б ад 25-га ліпеня 1931 г.

Заслухаўшы інфармацыю аб ходзе рэалізацыі пазыкі «Трэці рашаючы год пяцігодкі», гарком пастанаўляе:

Гарсавету разам з гарпрафсаветам неадкладна арганізаваць масавую праверку ахопу падпіскай рабочых і служачых паасобных прадпрыемстваў і ўстаноў і забясьпечыць сваечасовае афармленьне падпіскі.

Гарфа, гарсампрамсаюзу і гаржылсаюзу скончыць рэалізацыю пазыкі сярод неарганізаванай часткі насельніцтва (саматужнікаў, членаў сем'яў) да 1-га жніўня г. г.

Адзначаючы слабыя тэмпы рэалізацыі пазыкі на вёсцы, як сярод калгасьнікаў, так асабліва сярод аднаасобнікаў, гарсавету і гарпрафсавету, гаркому ЛКСМ і ўсім ячэйкам КП(б)Б неадкладна дабіцца рашучага пералому ў гэтай працы з тым, каб кантрольнае заданьне бязумоўна было выканана не пазьней 1-га жніўня.

Усім гарпарт'ячэйкам арганізаваць выезды брыгад у падшэфныя сельсаветы для ўзмацненьня рэалізацыі пазыкі.

Начальніку падзіву абгаварыць пытаньне аб мэтадах удзелу лягэрных воінскіх частак у рэалізацыі пазыкі сярод акаляючага сельскага насельніцтва.

У мэтах дапамогі ўзмацненьню рэалізацыі пазыкі ў сумежных раёнах, узяць на буксір адстаючыя наступныя раёны: Лёзьнянскі, Гарадоцкі, Сіроцінскі і Бешанкавіцкі.

Даручыць тав. Ждану накіраваць брыгады ў гэтыя раёны.

Разам з гэтым выклікаем Гомельскі і Менскі гаркомы пасьледваць нашаму прыкладу і ўзяць на буксір ня менш як па чатыры вясковых раёны.

Рэдакцыі «Віцебскі Пралетары» узмацніць асьвятленьне ў друку ходу кампаніі, зьвярнуўшы асаблівую ўвагу на ход дапамогі адстаючым раёнам.

Фабрыка „Прафінтэрн" прэміявана за найлепшае распаўсюджваньне пазыкі

Пастановай НКФ БССР камсод фабрыкі „Прафінтэрн" за шырока разгорнутую масавую працу па рэалізацыі пазыкі „Трэці рашаючы год пяцігодкі" і поўнае выкананьне і перавыкананьне кантрольнага заданьня прэміявана сумай у 750 руб.

Перавыканалі заданьне на 2.625 р.

Калгас «Чырвоная армія» кантрольную лічбу па распаўсюджваньні пазыкі «Трэці рашаючы год пяцігодкі» перавыканаў і замест 4.000 даў 6.625 р.

Сьледуйце нашаму прыкладу

Рабочыя фабрыкі **«Прагрэс»**, улічваючы важнасьць пазыкі «Трэці рашаючы год пяцігодкі», **накіроўваюць свайго рабочага - ударніка т. Сапгіра** для дапамогі ў ліквідацыі прарыву і ўзяцьця на буксір адстаючага **Лёзьненскага раёну.**

АДОЗВА ЦК, СНК І ЦЭНТРАСАЮЗУ НЕ ДАЙШЛА ДА РАБОТНІКАЎ ПРЫЛАЎКУ

ЦРК працягвае апартуністычную маруднасьць у перабудове сваёй работы

Перабудаваць работу каапэрацыі адпаведна з тэмпамі сацыялістычнага будаўніцтва

(На агульна-гарадзкой канфэрэнцыі працаўнікоў саюзу каапэрацыі і дзяржгандлю)

23 га і 24-га ліпеня адбылася агульна-гарадзкая канфэрэнцыя працаўнікоў саюзу каапэрацыі і дзяржгандлю па пытаньні аб перабудове сыстэмы каапэрацыі ў зьвязку з адозвай ЦК УсеКП(б), СНК і Цэнтрасаюзу.

Прадстаўнік гарпрафсавету т. **Рубін** у сваёй уступнай прамове казаў аб тых буйных дасягненьнях, якія мы маем па ўсяму Саюзу і ў прыватнасьці па Віцебску, дзе рост валавой прадукцыі за 1 год узрос з 87 млн. руб. да 167 млн. руб. Пушчана новая швэйная фабрыка, будуюцца шчацінны і трыкатажны камбінаты. Усе гэтыя посьпехі дасягнуты, дзякуючы правільнаму кіраўніцтву нашай партыі і вялікаму энтузіязму саміх працоўных мас. Далей тав. Рубін казаў аб тым вялікім значэньні, якое мае фінплян, які павінен быць выканан працоўнай арміяй савецкіх, каапэрацыйных і гандлёвых служачых. Выкананьне фінпляну і перабудова працы каапэрацыі ў адпаведнасьці з новымі гаспадарчымі задачамі—кажа т. Рубін—ёсьць залог выкананьня задач трэцяга рашаючага году пяцігодкі.

Старшыня праўленьня ЦРК тав. **Фальковіч** у сваім дакладзе аб перабудове спажывецкай каапэрацыі ў адпаведнасьці з адозвай ЦК УсеКП(б), СНК і Цэнтрасаюзу казаў, што паралельна з ростам сацыялістычнай прамысловасьці і сельскай гаспадаркі ў нас расьце і мацнее вялікая каапэрацыйная сыстэма. Мы маем 61 проц. каапэраванага насельніцтва. Таваразварот з 1 млрд. у 1921 г. павялічыўся да 64 млрд. у 1930 годзе. Далей тав. Фальковіч гаварыў аб маючыхся недахопах і хваробных зьявішчах у рабоце спажывецкай каапэрацыі. Наша каапэрацыя яшчэ ня зьнішчыла чаргі. Яна яшчэ паўнасьцю не забясьпечвае рабочага прадуктамі сельскай гаспадаркі. Шмат вырабляемых у Віцебску тавараў (дрожджзавод) тут-жа ў горадзе няма.

Нашы магазыны ў большасьці знаходзяцца ў антысанітарным становішчы. У Віцебску маецца 21 зачыненых разьмеркавацеля, але ніводзін з іх яшчэ не прыстасаваў сваей працу да рабочага спажыўца. Наш каапэрацыйна-гандлёвы апарат хварэе **бюракратызмам, цыганінай і нават шкодніцтвам.** У нашай каапэрацыі яшчэ маецца шэраг хваробных зьявішчаў, якія адбіваюцца на рабочым спажыўцу, а значыцца і на выкананьні прамфінпляну. Вось чаму ЦК УсеКП(б), СНК і Цэнтрасаюз зьвярнуліся з адозвай аб перабудове спажывецкай каапэрацыі да усёй рабочай клясы, каб прыстасаваць яе да выкананьня торгпрамфінпляну. Трэба неадкладна правесьці шэраг мерапрыемстваў, якія б забясьпечвалі правядзеньне гэтай адозвы ў жыцьцё. Неабходна арганізаваць галінавыя аб'яднаньні, якія-б адказвалі за сваечасовую дастаўку, за якасьць і колькасьць таго ці іншага прадукту. Трэба пашырыць каапэрацыйна-гандлёвую сетку, ліквідаваць таваранакапленьні, паскорыць таваразварот.

Неабходна перабудаваць і праверыць каапэрацыйны апарат, наблізіць яго да нізоў. Кожны каапэрацыйна-гандлёвы працаўнік павінен актыўна ўдзельнічаць у перабудове ўсёй каапэрацыйнай сыстэмы, а не чакаць загадаў зьверху. Усе гэтыя мерапрыемствы павінны быць тэрмінова ажыцьцяўлёны, бо гэтага патрабуюць інтарэсы прамысловасьці, інтарэсы трэцяга рашаючага году пяцігодкі.

Прадстаўнік ЦП саюзу саўгандслужачых т. **Фрыдлянд** застанаўліваецца на тых задачах, якія стаяць перад кожным працаўніком у перабудове працы каапэрацыі. Неабходна наладзіць сувязь паміж гаспадарнікамі і прафсаюзнымі арганізацыямі. Трэба дапамагчы нашым маладым сельпо, якія яшчэ не прыстасавалі сваю працу ў адпаведнасьці з рэканструкцыяй сельскай гаспадаркі. Неабходна шырока разгарнуць сацспаборніцтва і ўдарніцтва з мэтай хутчэйшага абароту да рабочага спажыўца і гэтым дапамагчы выкананьню нашых гаспадарчых плянаў. Трэба перавесьці на зьдзельшчыну працаўнікоў каапэрацыі, каб кожны працаўнік ведаў свой дзённы торгфінплян.

Паскорыць таваразварот, ліквідаваць абязьлічку ў таваразвароце, упрасьціць і спэцыялізаваць кіраўніцтва справай забесьпячэньня, перавесьці каапэрацыю на гаспадарчы разрахунак—вось задачы перабудовы спажывецкай каапэрацыі.

У спрэчках выказалася 10 таварышоў.

Тав. Глазман паказвае, што т. Фальковіч не крытыкаваў памылкі ЦРК і яе галоўку у той час, калі кіраўніцтва было дрэннае, у выніку чаго маюцца недахопы ва ўсіх галінах каапэрацыйнай працы. Зачыненым разьмеркавацелям адпушчаны самыя дрэнныя памяшканьні. З боку партыйных і прафсаюзных арганізацый не адчуваецца кіраўніцтва ў палепшаньні працы каапэрацыі.

Тав. Багданаў адзначыў, што на гаспадарчы разрахунак ЦРК не перайшоў. Таваразварот выконваецца на 50 проц. Зачыненыя разьмеркавацелі ня маюць адпаведных тавараў. У час, калі ў ЦРК гародніны хапае, у ЗРК яе зусім няма.

Тав. Равін. З моманту адкрыцьця зачыненых разьмеркавацеляў маюцца значныя дасягненьні, але ёсьць і недахопы. Рабочы стаіць па 2—3 гадзіны ў чарзе за атрыманьнем пайка. Быў выпадак, калі ў ЗРК мэталістых рабочым адпускалася сала на працягу 10 дзён, якое было (па аналізу бакінстытуту) нягодным для ўжываньня. Каштоўныя рацыяналізатарскія прапановы, якія ўносяцца ў кнігі скаргаў, у жыцьцё не ператтвараюцца. Торгфінплян павінен выпрацоўвацца не габінэтным шляхам, а ўсёй масай каапэрацыйна-гандлёвых служачых.

Тав. Якімаў. ЦП саюзу саўгандслужачых і Белкаапсаюз ня кіруюць нізавой сеткай каапэрацыі. ЦП кіруе зьверху, наогул, але канкрэтнага штодзённага кіраўніцтва няма. Нізавыя працаўнікі справай палепшаньня працы каапэрацыі таксама ня цікавяцца.

Тав. Выдрэвіч. У сельпо і райспажыўсаюзе не хапае каапэрацыйных кадраў, а тыя, якія маюцца, мала падрыхтаваны. Праца саматужнай каапэрацыі таксама кульгае. Торгфінпляны ня выконваюцца і нікім не кантралююцца. Сельпо на гаспадарчы разрахунак не пераведзена, зьдзельшчыны таксама няма. Кіраўніцтва ў гэтым напрамку з боку ЦП і Белкаапсаюзу ня было.

Тав. **Аўрусін** застанаўляе ўвагу канфэрэнцыі на тым, што ў саюз працаўнікоў каапэрацыі і дзяржгандлю сацспаборніцтва і ўдарніцтва ў загоне. Саюз яшчэ не павярнуўся тварам да вытворчасьці. Эканомвытворчыя нарады не працуюць. Калі ў Віцебск прыехалі прадстаўнікі ад ЦП тт. Варабейчык і Герчыкаў, дык іх «кіраўніцтва» заключалася ў тым, што яны толькі паначавалі ў цэнтральнай гасьцініцы і ўехалі.

Тав. Піскунова адзначыла дрэнную працу нізавых прафсаюзных органаў. Ніякай працы з ударнікамі не вядзецца, а ёсьць папярова-апартуністычнае кіраўніцтва.

Астатнія выступаўшыя ў спрэчках адзначылі таксама шмат недахопаў у працы каапэрацыі.

Канфэрэнцыяй прынята рэзалюцыя з шэрагам мерапрыемстваў, якія павінны быць ператвораны ў жыцьцё, паставіць працу каапэрацыі ў адпаведнасьці з тэмпамі сацбудаўніцтва і дапамагчы выкананьню пяцігодкі ў чатыры гады.

І. М. Вальфсон.

Зьнішчыць брыдкасьці ў ЗРК панчошніц

ЗРК панчошніц яшчэ не перабудаваў сваю працу ў адпаведнасьці з рашэньнямі ЦК УсеКП(б), СНК і Цэнтрасаюзу. Памяшканьне, у якім знаходзіцца ЗРК, вельмі цёмнае і калі ў магазын заходзяць 10—15 чал., дык нельга павярнуцца. Заўсёды, каб атрымаць тавар, прыходзіцца стаяць у вялікай чарзе. ЗРК не клапаціцца аб забесьпячэньні прамтаварамі ў першую чаргу ўдарнікаў. Некаторыя ўдарнікі ня маюць ударных кніжак.

Ня лепш абстаіць справа і з забясьпечаньнем рабочых буфэтам і сталовай. У буфэтах брудна, па сьценах поўзаюць прусакі. Прадукты прадаюцца недобраякасныя. Абеды ў сталовую дастаўляюцца дрэнныя. Меліся выпадкі, калі рабочыя пакідаліся без абедаў (рамонтны цэх). ФЗМК і праўленьне ЗРК дагэтуль яшчэ ня ўключыліся ў дэкаднік праверкі работы каапэрацыі.

Усе гэтыя брыдкасьці трэба тэрмінова зьнішчыць.

І. Эйллім.

Забясьпечыць перавозку хлеба тарай

У абозе ЦРК маюцца скрынкі для развозкі хлеба па магазынах. Скрынкі знаходзяцца ў разбураным становішчы і перавозімы ў іх хлеб заўсёды пакрываецца пылам і ламаецца. Аб гэтым неаднаразова гаварылі загадчыку транспартам Барадуліну, які ніякіх мер для прывядзеньня ў належны парадак скрынак ня прымае.

Пайнік.

У кампартыю

БЭРЛІН, 24. Абвясьцілі забастоўку 5.500 рабочых мэталюргічнага заводу «Дзілінгерхютэ» у адказ на зьніжэньне зарплаты на 38 проц. Прафбюракраты спрабавалі ўтрымаць рабочых ад барацьбы і зьвярнуліся са скаргай к дзяржаўнай пасрэднай камісіі, якая пацьвердзіла трэбаваньне прадпрыемцаў.

Прадпрыемцы мэталёвай прамысловасьці паўночна-заходняга раёну Нямеччыны высунулі патрабаваньне аб новым зьніжэньні зарплаты на 15—20 проц.

З усіх канцоў Нямеччыны працягваюць паступаць зьвесткі аб пераходзе с.-д. рабочых у кампартыю. У горадзе Ален (Вюртэмберг) 30 с.-д рабочых выступілі з арганізацыі. Мясцовы саюз рэспубліканскага сьцягу абвясьціў сябе распушчаным. Большасьць членаў гэтага саюзу ўступілі у кампартыю ці ў антыфашысцкія саюзы. У Менгене былыя члены с.-д. на чале з іх доўгалетнім старшынёй арганізавалі кам'ячэйку. У Мюнхене за апошнія дні ў кампартыю ўступіла 71 с.-д. рабочых.

Згоднікі заклікаюць да ратаваньня капіталізму

БЭРЛІН, 23. Праўленьне згодніцкага інтэрнацыяналу прафсаюзаў прыняла рэзалюцыю, у якой паказваецца, што зараз асноўнай задачай зьяўляецца ратаваньне нямецкай гаспадаркі і тым самым гаспадаркі эўрапейскай. Уздаўшы хвалу Гувэру за яго прапанову, рэзалюцыя падкрэсьлівае, што ўсе прафсаюзныя арганізацыі павінны дапамагаць спрыяючаму завяршэньню вядучыхся зараз міжнародных перагавораў аб палепшаньні крытычнага фінансавага становішча.

Рэвалюцыйны рух у Гішпаніі

МАДРЫД, 23. Над горадам **Сэвільля** (Гішпанія), рыхтуючыся к прыдушэньню рэвалюцыйнага руху, нізка лятаюць узброеныя кулямётамі аэрапляны. Маса арыштаваных. Прыступілі к рабоце ваенныя суды. Бастуючыя спрабуюць адбіваць арыштаваных. Па канвойных была адкрыта страляніна, у час якой 4 чал. забіты. Быў адкрыт артылерыйскі агонь. У порт прыбыла ваенная судно. Забіты капітан грамадзянскай гвардзіі, жандармскі капітан і паліцэйскі. За апошнія 2 сутак забіта 11 чал., раненых налічваецца 145.

У правінцыі Сэвільльі адбыліся сутычкі паміж рабочымі і грамадзянскай гвардзіяй, прычым 1 чал. забіт і шмат ранены.

У Героне рабочыя атакавалі казармы грамадзянскай гвардзіі.

У Мароне ранены чатыры дэманстранты.

У Барсэлоне ў час сутычкі рабочых з паліцыяй паліцэйскі афіцэр, два паліцэйскія агенты і некалькі рабочых ранены.

У Авіеда забаставалі гарнякі.

У каленіяльных раёнах

ПАРЫЖ, 20. Газэты француская каленіі Індакітая ўзмоцнена абгаварваюць напружанае становішча, якое стварылася ў Анаме. «Амі ды пепль Энто дыпуа» піша, што салдаты днём і ўначы абходзяць сёлы, тэрарызуючы насельніцтва ўсякага роду гвалтамі: забойствамі, падпаламі, згвалтаваньнем жанчын. Ад насельніцтва, галадаючага і жабрацтвуючага ўлада патрабуе грошай.

Далей газэта кажа аб лютым абхаджэньні ўлады з няплатнікамі падаткаў: зьбіваньне, забойствы і падпалы жыльля. Сяляне вымушаны прадаваць па самых нязначных цэнах зямлю і інвэнтар. Апрача таго, пачаўся гандль малымі дзяцьмі.

Уцечка золата з Англіі ўзмацняецца

ЛЁНДАН, 25. За ўчорашні дзень з Англіі вывезена золата на 5.260.950 фунтаў стэрлінгаў. Патрабаваньні на золата на сёньняшні дзень правышаюць гэту суму. Золата вывозіцца ў тэрміновым парадку на параходах і аэрапляних. Па вылічэньнях друку ўцечка золата з Англіі за час з 15 ліпеня выражаецца ў 22 млн. фунтаў стэрлінгаў, што складае каля 15 проц. залатога запасу ангельскага банку.

Лёзунг абароны СССР—самы папулярны лёзунг у Польшчы і Зах. Беларусі

З прывітальнай прамовы прадстаўніка КПЗБ і падпольнага камуністычнага друку Заходняй Беларусі

Таварышы! Маю даручэньне вітаць ваш зьезд ад імя Цэнтральнага Камітэту Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі, ад імя рэвалюцыйнай работніцка-сялянскай прэсы і карэспандэнтаў Заходняй Беларусі, якія моцна стаяць на пазыцыях рэвалюцыйнай барацьбы супроць фашысцкай дыктатуры.

У той час, як увесь капіталістычны сьвет перажывае цяжкі эканамічны крызыс, у СССР—бацькаўшчыне міжнароднага пралетарыяту, мы бачым буйны рост сацыялістычнага будаўніцтва. Будуюцца сотні новых фабрык і машынатрактарных станцый, паўстаюць новыя прамысловыя асяродкі, шпаркім тэмпам ідзе працэс калектывізацыі сельскай гаспадаркі, і на гэтай падставе адбываецца ліквідацыя кулацтва як клясы, сыстэматычна паляпшаецца матар'яльнае становішча рабочых, калгасьнікаў і бядняцка-серадняцкіх мас сялянства.

Пераможнае сацыялістычнае будаўніцтва ў СССР аказвае вялічэзны рэвалюцыянізуючы ўплыў на ўсю Польшчу, а асабліва на Заходнюю Беларусь, якая ўсімі сваімі ніцямі цесна зьвязана з Беларусьсю Савецкай. Таму вы, таварышы, прымаючы актыўны ўдзел у сацыялістычным будаўніцтве, робіце фактычна справу **міжнароднай пралетарскай рэвалюцыі**. Таму ва ўсёй Польшчы, як і Заходняй Беларусі, **няма больш папулярнага лёзунгу, як лёзунг абароны Савецкага Саюзу**. І нясецца гэты лёзунг ад фабрыкі да фабрыкі, ад капальняў Сілезіі і Дамбровы да фабрык Лодзі і Варшавы, ідзе ад вёскі да вёскі, пранікае ў казармы салдат польскай імпэрыялістычнай арміі і за краты фашысцкіх вастрогаў—**мабілізуючы і гуртуючы рабоча-сялянскія масы да абароны Савецкага Саюзу**. З усіх куткоў фашысцкае Польшчы нясецца—вокліч пралетарыяту: «рукі прэч ад СССР!».

1. Пад цяжарам падаткаў і шарваркаў

Зусім адваротную карціну мы маем у фашысцкай Польшчы, Польшча пад урадам фашысцкай дыктатуры Пілсудскага разам з усім капіталістычным сьветам перажывае цяжкі эканамічны крызіс як у галіне прамысловасьці, так і ў галіне сельскай гаспадаркі. Цяперашні крызіс буржуазнай Польшчы ёсьць наймацнейшы з усіх тых, якія адбываліся ў папярэднія часы. Гэты крызіс зьяўляецца крызісам сьмяротным, які будзе канцом фашысцкай Польшчы. Шукаючы выхаду з гэтага крызісу, буржуазія ўсе цяжары перакладае на плечы шырокіх працоўных мас. Сыстэматычна і гвалтоўна курчыцца прамысловая вытворчасьць, дзесяткі тысяч беспрацоўных выкідваюцца на брук, асуджаюцца на галодную сьмерць. Рэштка рабочых, якія яшчэ маюць працу на фабрыках, сьціснуты ў жалезныя абцугі фашысцкай рацыяналізацыі, якая выціскае з іх апошнія кроплі крыві і поту, у два—тры разы павялічваючы інтэнсыўнасьць працы. Рабочы дзень павялічваецца, а заработкі ня толькі намінальна, але і рэальна **сыстэматычна зьніжаюцца**.

Сялянства ўсёй Польшчы, асабліва акупаванай польскім імпэрыялізмам **Заходняй Беларусі, стогне пад цяжарамі падаткаў і прымусовай працы, так званых шарваркаў, якія літаральна руйнуюць найшырэйшыя бядняцка-серадняцкія масы, асуджаюць іх на галодную сьмерць**. Робячы свае «ашчаднасьці», урад не забыўся і аб беспрацоўных, якіх пазбавіў усякіх дапамог, у якіх адабраў з вуст апошні кавалак хлеба. Фашысцкаму ўраду Пілсудскага патрэбны мільярды на ваенную падрыхтоўку, на новыя танкі, на атрутныя газы, на аэрапланы, на паліцыю і шпікаў, каб напасьці на бацькаўшчыну міжнароднага пралетарыяту СССР, каб задушыць рэвалюцыйную і нацыянальна-вызваленчую барацьбу польскіх рабочых і сялян і прыгнечаных народаў, а беспрацоўныя могуць сабе паміраць з голаду, гэта фашысцкага ўраду не датычыцца.

У апошнія тыдні гэты крызіс яшчэ больш абвастрыўся. Паўстаў бюджэтны дэфіцыт. Польскі злоты пачаў хістацца, пагражаючы канчаткова зламацца. Урад, панічна рыхтуючыся перад інфляцыяй, пачаў рабіць «ашчаднасьці», зразумела коштам працоўных мас, і ў першую чаргу коштам чыгуначнікаў і ўрадавых працаўнікоў, заробкі якіх аказаліся скарочанымі ад 30 да 40 проц. папярэдняга заробку. Дзеля гэтага сярод іх паўстала вялікае нездавальненьне і гатоўнасьць да забастовачнай барацьбы. Колішняя апора фашысцкай дыктатуры — чыноўнікі таксама наракаюць—гэта нараканьне накіроўваецца выразна супроць фашысцкай дыктатуры і прымае рэвалюцыйнае аблічча.

2. Лютуе белы тэрор

Адначасова з абвастрэньнем і паглыбленьнем крызісу, узмацняецца белы тэрор і нацыянальны ўціск усёй Польшчы, а асабліва Заходняй Украіны і Заходняй Беларусі. Дэкрэтам прэзыдэнта фашысцкай рэспублікі Віленшчына аказалася ўключэнай у пагранічную паласу, што фактычна азначае падрыхтоўку абставін да ўвядзеньня ваеннага палажэньня. З Заходняй Беларусі пачынаюць масава высяляцца рэвалюцыйныя рабочыя і сяляне, што фактычна азначае падрыхтоўку і ачышчэньне тылу беспасрэднага нападу на СССР, бо тэрыторыя Заходняй Беларусі ёсьць тая тэрыторыя, на якой разыграюцца будучыя ваенныя падзеі. На гарады і вёскі пачынаюць наяжджаць што раз часьцей карныя экспэдыцыі, што ўжо мела месца ў Падбродзьдзі і Кобрыне—каб масавымі катаваньнямі спыніць рэвалюцыйную барацьбу рабочых і сялян супроць акупантаў. У Клецку зачынена беларуская гімназія, а ў Вільні яўрэйская настаўніцкая сэмінарыя і школа імя Фруга, што зьяўляецца фактам гвалту і нацыянальнага ўціску з боку фашысцкага ўраду над беларускім і яўрэйскім народам. Ёсьць выданы дэкрэт прэзыдэнта, што ў працягу 7 год ня можа быць адчынена ніводная беларуская школа. Самым апошнім фактам нацыянальнага ўціску і тэрору зьяўляецца справа зачыненьня і арышту паўнамоцнай камісіі таварыства беларускай школы ў Вільні, што было зроблена 11-га ліпеня г.г. Ва ўсёй гэтай працы фашысцкі ўрад мае дапаможнікаў з боку беларускіх нацыянал-фашыстаў Луцкевічаў, Акінчыцаў, Ярэмічаў, Астроўскіх, якія дапамагаюць фашысцкаму ўраду душыць нацыянальна-вызваленчы рух беларускага народу.

3. Усё вышэй узьнімаецца рэвалюцыйная хваля

У адказ на белы тэрор і нацыянальны ўціск маем усеагульны ўзрост рэвалюцыйнай барацьбы ва ўсёй Польшчы. Забастоўка варшаўскіх трамвайшчыкаў, якая насіла баявы рэвалюцыйны характар, усім сваім лёзам была накіравана супроць фашысцкай дыктатуры і прайшла пад кіраўніцтвам прафэсыянальнай апазыцыі. Барацьба беспрацоўных як у Сілезіі, так і Барыславе на Заходняй Украіне, якая насіла вельмі востры характар, бо даходзіла да збройных сутычак з паліцыяй, і шэраг іншых фактаў гавораць аб тым, што **рэвалюцыйная барацьба пашыраецца і завастраецца**. У гэтай барацьбе паліцыя ўжо сыстэматычна ўжывае зброю, **атручваючыя газы**, калечыць і забівае дзесяткі людзей. Усё гэта гаворыць аб тым, што **рэвалюцыйная барацьба ў Польшчы прымае ўжо формы адкрытай грамадзянскай вайны**.

У Заходняй Беларусі таксама нарастае высокая хваля рэвалюцыйнай барацьбы. Сьведчаць аб гэтым ясна апошнія падзеі, як аднадняўная генэральная забастоўка тэкстыльных рабочых у Беластоку, як агульная забастоўка камунальных рабочых у Горадні, як вострая некалькі дзённая барацьба віленскіх беспрацоўных. Беспрацоўныя Вільні выйшлі на вуліцу з жаданьнем «хлеба і працы», **а фашысцкі ўрад адказаў ім залпам і шаблямі**. Беспрацоўныя закідалі паліцыю каменьнямі. Прыехаў эскадрон коннай паліцыі, якая голымі шаблямі разагнала дэманстрантаў, але дэманстранты і цяпер стойка абараняліся, абкідваючы конных паліцэйскіх градам каменьняў, пры гэтым паранілі некалькі паліцэйскіх і 16 паліцэйскіх коняй. **Пахаваўшыся за платы гародаў, дэманстранты яшчэ доўга адбіваліся ад паліцыі**. Паліцыя правіла масавыя арышты.

4. Беларуская вёска паўстае на барацьбу

Ня сьпіць таксама і заходня-беларуская вёска. Выступленьні сялян проці грабежніцкай зямельнай палітыкі фашысцкага ўраду, проці падаткаў і шарваркаў, прымаюць усё больш масавыя баявыя формы, даходзяць да крывавых сутычак паміж сялянамі і паліцыяй, як гэта мела месца ў **вёсцы Лучына**, Каменец-Кашырскага павету, дзе тысяча ўзброеных косамі і сякерамі сялян прагналі прэч з сваіх палёў фашысцкіх чыноўнікаў або як у **вёсцы Крываносы, Дзяцялавічі**, у Ваўкавіскім павеце. Апрача гэтага, маем пашырэньне выпадкаў стыхійнай барацьбы сялян Заходняй Беларусі, якая праяўляецца ў фактах **раскручваньня рэльсаў, падпалаў назёмных і абшарніцкіх лясоў і паленізатарскіх школ, забойства паліцэйскіх і вайсковых асаднікаў** і г. д. Сялянства па свойму адказвае на ўціск, на тэрор, на зьдзек і па свойму робіць правільна. **Заходнія беларускія рэзэрвы пралетарскае рэвалюцыі падцягваюцца да рэвалюцыйнага авангарду пралетарыяту, выраўніваюць фронт і разгортваюць атаку супроць фашысцкай дыктатуры.**

5. Расьце ўплыў КПЗБ

Ва ўсіх баёх расьце ўплыў і ўзмацняецца кіраўнічая роля КПЗБ, якая стараецца накіраваць гэтую барацьбу ў агульнае рэчышча пралетарскай рэвалюцыі Польшчы. На фоне ўзросту рэвалюцыйных настрояў раскладаюцца і слабнуць сацыял-фашысцкія партыі — НПС, Бунд і інш., але адначасова завастраюць сваю апазыцыйную фразу. Барацьба з гэтымі партыямі ва ўмовах ЗБ зьяўляецца **вельмі** важнай задачай.

6. Рэвалюцыйная прэса ЗБ—у цісках шалёнага тэрору

Таварышы! У такіх умовах рэвалюцыйная рабоча-сялянская прэса ЗБ адыгрывае вялічэзную ролю, **яна зьяўляецца масавым агітатарам, арганізатарам і выказальнікам рабоча-сялянскіх мас у іх барацьбе за пралетарскую дыктатуру**. Гэта роля яшчэ больш павялічваецца ва ўмовах поўнай дыспрапорцыі, якая існуе паміж шырокім ростам рэвалюцыйнай актыўнасьці мас і арганізацыйнымі магчымасьцямі нашай партыі ўладаць гэтай актыўнасьцю. У гэтых умовах, дзе ня мае доступу сама партыя, яе замяняе наша прэса, якая пранікае ў масы, кліча да барацьбы, паказвае шлях барацьбы.

Умовы разьвіцьця рэвалюцыйнай рабоча-сялянскай прэсы вельмі цяжкія, фашысцкая цэнзура **пазачыняла ўсе радыкальныя рабоча-сялянскія нацыянальна-вызваленчыя газэты на ЗБ**. У Польшчы і на Заходняй Украіне засталіся адна—дзьве радыкальныя газэты, як «Самапомац Хлопска» або «Сельроб», але яны заўсёды выходзяць з белымі старонкамі і прасьледуюцца.

7. Камуністычная прэса—нелегальная

Што датычыць газэт камуністычных, дык усе яны з самага пачатку **былі і засталіся нелегальнымі**. Мы на Заходняй Беларусі маем наступныя выданьні: **«Бальшавік»**—часопіс, тэарэтычны орган ЦК КПЗБ, існуе ад часоў паўстаньня КПЗБ, выдаецца ў беларускай мове; **„Чырвоны сьцяг“**—газэта, орган ЦК КПЗБ для шырокіх сялянскіх мас, таксама існуе ўжо 8 год, выходзіць на беларускай мове; **„Дазвальні“** і **„Куймы Броні“**—газэты для польскіх рабочых ЗБ, выходзяць на польскай мове; **„Бальшавік“**—газэта для яўрэйскіх рабочых, выходзіць на яўрэйскай мове; **„Малады Камуніст“**—орган ЦК КСМ ЗБ, выходзіць на беларускай мове і шмат іншых брашур і адозваў.

Наша прэса дужа чытаецца і пашыраецца сярод мас. Маем выпадкі, калі **нашу прэсу, адабраную паліцыяй, рабочыя з боем адбівалі назад і масава чыталі**.

Для большай характарыстыкі масавага пашырэньня нашай прэсы скажу, што **мы і за кратамі фашысцкіх вастрогаў маем сваю прэсу—рукапісы**. Гэта прэса жорстка, жорстка караецца фашысцкім урадам. У гэтым годзе віленскі акруговы суд прыгаварыў **на 4 гады катаргі т. т. Цьвяткова, Макоўскага, Кастанчука і Кішкеля за тое, што яны ў віленскім вастрозе, на Лукішках, выдавалі і рэдагавалі газэту—рукапіс „Лукішскі сьцяг“**.

8. За ўмацаваньне рабсялькораўскай сувязі

Таварышы! Задача рабоча-сялянскіх карэспандэнтаў Савецкай Беларусі ў адносінах да рэвалюцыйнага руху і рэвалюцыйна рабоча сялянскай прэсы ЗБ заключаецца ў тым, каб пільней і ўважлівей сачыць за разьвіцьцём рэвалюцыйных падзей на ЗБ, значэньне якіх з кожным днём павялічваецца, каб шырока і правільна інфармаваць рабоча-сялянскую грамадзкасьць аб гэтых падзеях. Для гэтага нам патрэбна **ўмацаваць узаемную сувязь паміж рабсялькорамі Савецкай Беларусі з невялічкай групай рабселькораў нашых нелегальных заходнія беларускіх газэт**. Мы з свайго боку зробім усё, каб шырокім масам рабочых і сялян ЗБ сказаць усю праўду аб БССР і СССР. **Будзем весьці рашучую барацьбу супроць хлусьні і ілжы, якую вядзе прэса нашых ворагаў супроць вас, супроць бацькаўшчыны міжнароднага пралетарыяту—СССР.**

Няхай жыве пераможная пралетарская рэвалюцыя ва ўсёй Польшчы!

Няхай жыве УсеКП(б)—кіраўнік і арганізатар пераможнага сацыялістычнага будаўніцтва ў СССР!

Няхай жыве Камуністычны інтэрнацыянал—штаб сусьветнай рэвалюцыі!

(Бурныя працяжныя воплескі, якія пераходзяць у авацыю. Усе ўстаюць, пяюць «інтэрнацыянал»).

Наладзіць нармальную працу на газэтным аддзяленьні камвузу

Згодна пастановы ЦК КП(б)Б у Віцебску пры вячэрнім камвузе арганізавана газэтнае аддзяленьне, але трэба адзначыць, што яно да сёньняшняга дню не наладзіла чотка сваёй працы. Замест 100 чалавек газэтнае аддзяленьне наведваюць усяго 20—25 чалавек.

На гэта мае вялікі ўплыў тое, што шэраг бюро парткалектываў ня выконвае маючуюся дырэктыву аб вызваленьні наведвальнікаў газэтнага аддзяленьня ад усіх нагрузак, а таксама не ўпарадкавана пытаньне аб зьменах. Апошнія два дні заняткі былі сарваны таму, што не зьявіліся кіраўнікі.

Трэба зараз-жа наладзіць працу газэтнага аддзяленьня камвузу і прыняць адпаведныя захады да тых сэкратароў парткалектываў, якія ня выконваюць дырэктывы аб вызваленьні наведвальнікаў газэтнага аддзяленьня ад нагрузак.

Грынман.

Падрыхтаваць кваліфікаваную рабсі

Шпарка растучай сацыялістычнай прамысловасьці

Камсамол, ФЗМК і аддзел кадраў павінны па-ударнаму ўзяцца поўнае і сваечасовае ўкамплектаваньне школ ФЗВ і курсаў ЦІП

Восенны набор правесьці па ўдарнаму

Шпаркі рост сацыялістычнай прамысловасьці з кожным годам прад'яўляе новыя патрабаваньні ў кваліфікаваных кадрах. Кузьні, якія рыхтуюць пралетарскія кадры для нашай сацыялістычнай прамысловасьці, зьяўляюцца ФЗВ і курсы ЦІП'у. Зараз перад гэтымі арганізацыямі стаіць адказная задача ўкамплектаваць у восенны набор лепшымі рабочымі і калгасьнікамі школы ФЗВ, курсы ЦІП'у.

Поўная ліквідацыя беспрацоўя і недаход рабочай сілы прад'яўляюць у пэрыяд восеньняга набору куды больш значныя патрабаваньні да арганізацый, якія ведаюць гэтым наборам з тым, каб правесьці данную кампанію бяз шкоды для вытворчасьці і выканаць поўнасьцю заданьне па ўкамплектаваньні лепшымі рабочымі і калгасьнікамі курсы і школы ФЗВ.

Вопыт працы вясновага набору паказаў, што арганізацыі, якія ведаюць вярбоўкай рабочай сілы, не праявілі належнай ініцыятывы ў сэнсе вернага і поўнага ўкамплектаваньня курсаў і школ. Адзін той факт, што на курсах ЦІП'у ня было ніводнай жанчыны, зьяўляецца лепшым паказальнікам недаацэнкі і бязуважлівых адносін да гэтай важнай задачы. У той час, калі мы зараз усю ўвагу арганізацый завастраем на папаўненьні нашых кадраў жанчынамі і членамі сем'яў рабочых, гэтакія адносіны арганізацый, ведаючых падрыхтоўкай кадраў, зьяўляюцца недапушчальнымі і гэта не павінна мець месца ў надыходзячую кампанію восеньняга набору.

Другім асноўным момантам, да якога трэба аднесьціся з усёй сур'ёзнасьцю, зьяўляецца ўкамплектаваньне курсаў і школ да патрабаваньняў нашай прамысловасьці. У мінулым мы мелі такі факт, што курсы ЦІП'у падрыхтоўвалі кадры, непатрэбныя зараз нашай прамысловасьці, у выніку чаго таварышы, скончыўшыя курсы, заставаліся працаваць на чорнай рабоце і не скарыстоўваліся па прызначэньні (бляхары, кровельшчыкі, сьлесары, вадаправодчыкі).

Трэба зараз-жа арганізацыям, якія ведаюць падрыхтоўкай кваліфікаванай рабочай сілы, заключыць умовы з адпаведнымі гаспадарчымі арганізацыямі на падрыхтоўку рабочай сілы патрэбных ім кваліфікацый.

Трэці асноўны момант—гэта нацыянальны склад вучняў. У практыцы мінулага набору мы бачылі, што на курсах ЦІП'у гэтаму пытаньню зусім ня было ўдзелена ніякай увагі. Нават загадчык і курсамі ня ведалі нацыянальнага складу вучняў. На гэты вучастак павінна быць завострана ўвага, каб прадстаячы набор быў забясьпечан нацыянальным складам, папаўненьнем школ і курсаў нацменшасьцямі.

Слабая пастаноўка культмасавай працы, нізкі палітычны ўзровень настаўніцтва ня даў патрэбных вынікаў у працы мінулага набору. Аб гэтым яскрава сьведчылі вылазкі антысэмітызму і шавінізму як з боку настаўніцтва, так і з боку вучняў. Зараз патрэбна праверыць склад настаўніцтва, папоўніць яго лепшымі кваліфікаванымі рабочымі ўдарнікамі з вытворчасьці.

Неабходна завастрыць увагу ўсёй грамадзкасьці вакол набору і ўкамплектаваньня школ ФЗВ і курсаў ЦІП'у клясава-вытрыманымі настаўнікамі. Усе арганізацыі: партыйныя, прафсаюзныя і гаспадарчыя павінны зьвярнуць максымум увагі на справу ўкамплектаваньня школ і курсаў лепшымі работнікамі і работніцамі. Толькі пры актыўным удзеле ўсіх арганізацый мы восенны набор правядзём па-ўдарнаму і тым дадзім магчымасьць нашым новым фабрыкам і заводам мець патрэбную кваліфікаваную рабсілу.

Скарачаючы тэрмін навучаньня, хутчэй дамо краіне кадры

Разгорнутае сацыялістычнае будаўніцтва патрабуе вялікай колькасьці спэцыялістых, як вышэйшай, так і сярэдняй кваліфікацыі. У зьвязку з гэтым у вячэрнім палітэхнікуме, які выпускае спэцыялістых сярэдняй кваліфікацыі, скарочаны тэрмін навучаньня да 3-х год (замест 4-х). Адначасова падвышана база камплектаваньня. Раней палітэхнікум будаваўся на базе 5—6 год навучаньня, у наступным годзе на базе сямігодкі, ці на падрыхтоўчых курсах за 7-мігодку. З прычыны таго, што вячэрні палітэхнікум прымае выключна рабочых ад варштату, якія ня заўсёды маюць адукацыю за сямігодку, пры палітэхнікуме арганізаваны падрыхтоўчыя курсы. Рабочыя, якія маюць адукацыю 5—6 год навучаньня, паступіўшы на падрыхтоўчыя курсы, за 6 месяцаў праходзяць праграму сямігодкі па галоўнейшых прадметах і пераходзяць у палітэхнікум.

Скарачэньне тэрміну навучаньня выклікае яшчэ ўвядзеньне вузкай спэцыялізацыі ў адпаведнасьці з пастановай XVI партзьезду. За кароткі тэрмін добраякасна можна падрыхтаваць толькі вузкага спэцыялістага. Да гэтага часу ў вячэрнім палітэхнікуме рыхтаваліся тэхнікі па двух спэцыяльнасьцях: мэханічнай і электра-тэхнічнай, рэзка выражанай спэцыяльнасьці ня было. З наступнага навучальнага году на кожным аддзяленьні ўводзіцца вузкая спэцыялізацыя, як кажуць профілі. Гэтыя профілі па свайму зьместу нічым не адрозьніваюцца ад профіляў ранішняга палітэхнікуму, гэта значыць, што вячэрні палітэхнікум выпускае спэцыялістых з аднолькавай кваліфікацыяй з ранішнім палітэхнікумам, бо як той, так і другі палітэхнікумы маюць адну задачу: здаволіць запатрабаваньні прамысловасьці Беларусі ў тэхніках спэцыялістых сярэдняй кваліфікацыі.

Такім чынам з наступнага навучальнага году вячэрні палітэхнікум будзе мець два аддзяленьні: мэханічнае і энэргетычнае. На мэханічным аддзяленьні будзе два профілі—машынабудаўнічы і студзёнай апрацоўкі мэталю, на энэргэтычным аддзяленьні будзе тры профілі: 1) электрычнай станцыі, сеці і лініі перадач, 2) электрыфікацыя прамысловых прадпрыемстваў і 3) цёплатэхнічны. Для кожнага профіля складзены асобныя навучальныя пляны. Спэцыялізацыя пачнецца ўжо з 1-га курсу.

Увядзеньне вузкай спэцыялізацыі палягчаецца тым, што з наступнага навучальнага году ўводзіцца мэтад праэктаў і тым, што ў вячэрнім палітэхнікуме вучацца рабочыя, якія ўжо маюць адпаведную вузкую спэцыяльнасьць на прадпрыемстве. **Р.**

Прыняць тэрміновыя меры да ўкамплектаваньня ФЗВ швэйнікаў чошніц

Фабзавуч абутнікаў пры **фабрыцы Лекерта** зьяўляецца адзіным на Беларусі, які рыхтуе кваліфікаваныя кадры для абутковай прамысловасьці. Ён мае ўсе магчымасьці для далейшага росту і пашырэньня. У восенны набор будзе набрана 40 вучняў, астатняя колькасьць будзе дабрана пасьля таго, як будзе выпушчана 90 вучняў, якія ў хуткім часе канчаюць курс навучаньня. Вялікім тормазам у працы ФЗВ зьяўляецца адсутнасьць дастатковай колькасьці машын і інструмантаў, як-та не хапае адной абцяжной машыны, двух накладачных, трох каблучных і чатырох швэйных. Няма належнага абсталяваньня і нават сталоў і скамеек. Калі зьвярнуліся ў ФЗВ будаўнікоў за дапамогай ў пабудове сталоў і скамеек, дык загадчык ФЗВ **Асінаўскі** адказаў: «дайце боты, тады дамо сталы». Ніякай працы па вярбоўцы і ўкамплектаваньні восеньняга набору вучнямі не вядзецца. Яшчэ не паступіла ніводнай заявы.

Швэйна-тэкстыльная прамысловасьць ва ўмовах Віцебску займае адно з першых месц і з кожным месяцам прад'яўляе ўсё большыя і большыя патрабаваньні ў кваліфікаванай рабочай сіле. Два волаты пяцігодкі—швэйная і панчошная фабрыкі, пабудаваныя па апошняму слову тэхнікі, патрабуюць высока-кваліфікаваных пралетарскіх кадраў. На гэтым вучастку мы мае прарыў.

Друк неаднаразова ўжо ваў аб ненармальнасьцях **краўцоў**, але яны ня зь надыходзячы восенны наб Віцшвэя знаходзіцца пад зрыву. У жніўні ФЗВ па няць 105 вучняў, але па с гадчыка ФЗВ **Шалыта** будзе... 25. Памяшканьня нату вучняў яшчэ няма.

Ня лепш абстаіць справа і **ФЗВ панчошніц**. Чэрвень быў правален. Замест 70 нята 4. Адсутнасьць па для інтэрнату не дае ма ўкамплектаваць поўнасьцю жніўні ў ФЗВ павінны быць 250 падлеткаў. Памяшкан рыкі «1-га мая» яшчэ не рам Да 1-га жніўня засталіся лі у якія патрэбна разгарнуц працу па камплектаваньні нікі першых дзён зьяўляюц вальняючымі. Маецца ўсяго Трохкутнікі фабрык павінны па ўдарнаму пераключыць цу на запаўненьне школ Ф веднай колькасьцю клясав маных вучняў. У гэтай важную ролю павінен адыгр самол і аддзел кадраў, якія запоўніць школы дзяцьмі калгасьнікаў.

Улічыць памылкі мінулага го

З курсаў ЦІП'у за апошні час выпушчана: 85 сталяроў, 125 цесьляроў, 73 сьлесары-вадаправодчыкі і 40 жасьцянікаў-кровельшчыкаў. Плян падрыхтоўкі выканан на 112,75 проц., але нягледзячы на перавыкананьне проценту заданьня, нягледзячы на здавальняючую работу вучняў, мы маем шмат недахопаў у скарыстаньні гаспадарнікамі дасланай ім маладой кваліфікаванай рабсілы. Так, на **цагельным заводзе**, дзе знаходзілася брыгада вучняў-курсантаў ЦІП'у ў колькасьці 30 асоб, якая працавала разам з прымацаваным брыгадзірам Вашчонкам і паказвала лепшыя прыклады ўдарнай работы—галавацкае распараджэньне адміністрацыі заводу сарвала гэты брыгадны мэтад работы. Яна перакінула брыгадзіра Вашчонка на іншую працу, у выніку чаго брыгада распалася. Курсанты, якія працуюць у Белбудканторы, абвясьцілі сябе ўдарнікамі, добра выконваюць свае абавязкі, але з боку адміністрацыі не вядзецца ўлік іх якаснай працы.

Гэтакіх фактаў ёсьць шмат. Усе яны гавораць за т некаторыя гаспадарчыя зацыі не дапамагаюць вучням падвысіць сваю кацыю.

У галіне культурна-в чай працы сярод ку ЦІП'у зроблена вельмі Насьценгазэта на курса за ўвесь час працы вышл кі адзін раз. Ударніцтва вучняў ня было падхоп адміністрацыяй, арганіз ўл'ку якаснага ні праф не вялося. У інтэрнатах ло нават сьвету, вучні антысанітарных умовах (б пасцельныя прылады, пад некалькі тыдняў ня м Сталоўка для вучняў ня арганізавана і ім прыхо харчавацца ў сталоўцы нага заводу. Не вялося скарыстоўваньня мат вучняў. Нацыянальны скл няў нездавальняючы і на было іх уліку.

Памылкі мінулага году ны быць зараз улічаны. ЦІП'у ў восенны набор ўкамплектаваць поўнас палепшыць абслугоўван няў. Бры

Замест дапамогі,—перашкоды

Праблема кіруючага тэхнічнага складу сярэдняй і вышэйшай кваліфікацыі зараз у цэнтры ўвагі савецка мадзкасьці. Асабліва стаіць пытаньне аб кір кадрах швэйнай прамысло якая ў старыя часы была цалкам саматужнай і ня сваіх спэцыялістых-арган раў, якія-б былі здольны нізаваць працэс у маштаб часнай буйнай фабрыкі.

Існуючы з нядаўніх ча Віцебску, швэйны тэхнікум на мэце падрыхтоўку ся тэхнічнага пэрсаналу для ных фабрык БССР—тэ тэхналёгічнага прац і тэхнікаў-мэхані Асеньні набор у тэхн па пляну па сэктару пра раў ВСНГ вызначан у касьці 60 чалавек, у тым ня менш 30 рабочых з вы часьці. Для тых рабочых, ня маюць поўных ведаў годкі, створаны падрыхт курсы з тэрмінам навуч да 1-га кастрычніка. Гэты бочыя наведваюць курсы ў ны ад працы на вытвор час: першую палову дэкад ніцай, другую—увечары. Н лікі жаль наведваньне курс зусім добрае. З 30 асоб н ваюць 21—22 і некаторыя ведваюць толькі чатыры д дэкаду замест 8. Гэта вык цякучасьць складу і адстава і пагражае зрывам кампле ваньня чарговага набору чых з прадпрыемстваў. Ка трэба абвінавачваць у гэ Толькі не слухачоў курсаў. наватых трэба шукаць с адміністрацыі, фабкому і н тораых прадпрыемстваў (абу вая, панчошная), якія ўпарт згаджаюцца перавесьці таг іншага рабочага на другую з ну ці ў іншую групу па вы ному дню. Гэтыя адносіны п прыемстваў да важнейшай с вы трэба зьнішчыць, як поў недааценку справы падрыхт кадраў. Трэба зараз-жа, па ня позна, прыняць усе зах да зьнішчэньня перашкод шляху падрыхтоўкі каманд кадраў швэйнай прамысловас

За марксысцкую вытрыманасьць у выкладаньні літаратуры

Пытаньне падрыхтоўкі кадраў зьяўляецца зараз адным з актуальнейшых у нашым сацыялістычным будаўніцтве, у галіне выкананьня пяцігодкі ў чатыры гады. Рабфакі ў сыстэме падрыхтоўкі кадраў павінны даць ідэалёгічна вытрыманых савецкіх спэцыялістых, таму якасьць падбору настаўнікаў, марксысцкі вытрыманых, ва ўсіх галінах працы павінна быць у асяродку увагі ўсёй грамадзкасьці.

Але з боку некаторых навучальных установаў мы маем нясур'ёзны падыход да гэтай справы, чаму можа быць прыкладам выкладчык расійскай літаратуры ў вячэрнім пэдагагічным рабфаку **Лубоўскі**, які адначасова зьяўляецца загадчыкам навучальнай часткі гэтай установы.

Лубоўскі лічыць, што асноўным момантам у вывучэньні літаратуры зьяўляецца жыцьцяпіс пісьменьнікаў, бо жыцьцяпіс з пункту погляду Лубоўскага—неабходны фактар для тлумачэньня той ці іншай творчасьці. Па Лубоўскаму выходзіць, што акрамя гэтага фактару магчыма карыстацца і іншымі крыніцамі для тлумачэньня творчасьці—такім чынам Лубоўскі, магчыма сам таго не разумеючы, упадае ў буржуазную культурна-гістарычную мэтадалёгію.

Гэты пункт погляду зьяўляецца бязумоўна антымарксысцкім і ідэалістычным, патрабуючым рашучай барацьбы з боку марксысцка-ленінскай мэтадалёгіі і літаратуразнаўства. Вывучаць літаратуру па марксысцкі, маністычна, гэта значыць усебакова дыялектычна вывучаць ўсю творчасьць, формы і зьмест, ні на хвіліну не адрываючыся ад клясавых узаемаадносін эпохі. Толькі такім чынам магчыма зрабіць вынікі аб клясавай накіраванасьці той ці іншай творчасьці.

Лубоўскі не зразумеў таго, што, ставячы творчасьць пісьменніка ў залежнасьці ад вузка разумеемай біяграфіі, ён упадае ў пераверзіянства, зацьвярджаючае, што пісьменьнік ня можа выйсьці з рамак сваёй клясы і абрачон на вечны кругаварот у межах псыхаідэалёгіі сваёй клясы.

І нарэшце, належнасьць творчасьці ад асобы пісьменьніка ставіць Лубоўскага на ідэалістычны пункт погляду, які заключаецца ў тым, што гісторыя літаратуры азначаецца біяграфіяй вялікіх пісьменьнікаў. Няверная мэтадалёгія Лубоўскага, як відаць, нікім не кантраліруецца, што дае яму магчымасьць прасоўваць у студэнцкія масы чуждыя марксызму погляды.

Жадаючы захаваць свае памылкі, Лубоўскі распаўсюджвае розныя чуткі аб маладых працаўніках, скончыўшых савецкія ВНУ і стаячых на пункце гледжаньня марксысцкай мэтадалёгіі ў выкладаньні літаратуры, абвінавачваючы іх у пераверзіянстве, кампрамэтуючы іх перад студэнтамі.

Адпаведныя арганізацыі павінны праверыць працу Лубоўскага і недапусьціць прасоўваньня клясава варожых поглядаў у масы пралетарскіх студэнтаў. **Ш—н.**

Другі Усебеларускі зьезд рабсельваенкораў ухваляе і далучаецца да пастаноў

усесаюзнай нарады пры «Правде» па пытаньнях рабселькораўскагага руху

Пастанова Усебеларускага зьезду рабсельваенкораў па дакладах т.т. Будзінскага і Курціка

Другі Ўсебеларускі зьезд рабсельваенкораў, заслухаўшы даклады тт. Будзінскага і Курціка па пытаньні рабселькораўскага руху, партыйнага кіраўніцтва ім і ўдарніцтва ў друку, а таксама паведамленьні аб рабоце 14-ці сэкцый Усебеларускага зьезду рабсельваенкораў—тт. Плоткіна (сэкцыя мэталяапрацоўчых прадпрыемстваў), т. Красінай (сэкцыя чыгуначна-воднага і шасэйнага трнспарту), т. Мінкіна (сэкцыя гарбарна-абутковай прамысловасьці), т. Платава (сэкцыя энэргетыкі і торфу), т. Вержбаловіча (сэкцыя дрэваапрацоўчых прадпрыемстваў), т. Міхайлава (сэкцыя жывёлагадоўлі), т. Лебедзева (сэкцыя тэхнічных культур), т. Кучынскага (сэкцыя перабудовы спажывецкай каапэрацыі), т. Барбунова (сэкцыя машына-трактарных станцый), т. Бэра (сэкцыя швэйнікаў і тэкстыльшчыкаў), т. Рагазінынікавай (сэкцыя рабселькораў), т. Чарнякова (сэкцыя жывой тэатралізаванай газэты), т. Фалкіна (сэкцыя паперы і паліграфіі), т. Прынца (сэкцыя шкла),—пастанаўляе:

1. Далучыцца да пастаноў апошняй Усесаюзнай нарады па пытаньні рабселькораўскага руху пры «Правде», улічваючы, што канкрэтныя задачы рабселькораў БССР па асобных важнейшых галінах народнай гаспадаркі БССР вызначаны ў пастановах сэкцый Усебеларускага зьезду рабсельваенкораў.

2. Распрацаваныя ў 14-ці сэкцыях Усебеларускага зьезду рэзалюцыі з усімі прынятымі сэкцыямі дадаткамі і зьменамі—зацьвердзіць, канстатаваць, што ў распрацоўцы і абгаварэньні праэкту рэзалюцыі сэкцый зьезду прыняло непасрэдны ўдзел 90 процантаў агульнай колькасьці дэлегатаў зьезду.

3. Забясьпечыць безадкладную масавую і грунтоўную прапрацоўку пастаноў 2-га ўсебеларускага зьезду рабсельваенкораў, а таксама пастаноў Усесаюзнай нарады пры «Правде» на спэцыялізаваных зьлётах рабсельваенкораў па асобных прафэсіях з шырокім прыцягненьнем спэцыялістаў, гаспадарнікаў і прафработнікаў.

Аўласенкі ня месца ў савецкай школе

Пра брыдкія паводзіны і ўчынкі настаўніка лучоскай школы Аўласенкі Міколы ужо пісалася ў насьценгазэце дому асьветы і насьценгазэце 19-й пачатковай школы, дзе ён працуе. Пісалася і ў «Віцебскім Пралетары», № 100 за 1931 г. Аўласенка імкнуўся сарваць сход сельсавету, замаскіраваў свой твар чужым прозьвішчам «Вульфсон». У час заняткаў з дзяцьмі Аўласенка біў вучняў ключом і ножыкам па галовах, а вучаніцы **Паташковай** адарваў рукаў. Калектыў 19-й пачатковай школы камуны імя Крупскай гэтыя брыдкія паводзіны выкрыў.

Зараз Аўласенка жыве пры школе. Аднойчы напіўшыся ён прыходзіць у дзеткамуну і пачынае буяніць. Гэта адбывалася на вачох выхаванцаў. На прапанову адміністрацыі і пастанову калектыву, школы і камуны аб забароне Аўласенкі хадзіць у камуну, ён пагражае забойствам. Калі да ўсяго гэтага дадаць, што бацька Аўласенкі абкладзен індывідуальна і што ён мае з ім цесную сувязь, адмовіўся ад падпіскі на пазыку, дык твар Аўласенкі будзе яскравым. Брыгада, якая вяла расьсьледваньне, павінна ў хуткім часе даць свае вынікі і пазбавіць савецкую школу ад такіх настаўнікаў.

Зацікаўлены.

Ураджаю пагражае зялёны шкоднік

У месячнік барацьбы са шкоднікамі сельскай гаспадаркі мабілізуем ...тальёны камсамольцаў і асоавіяхэмаўцаў на зьнішчэньне яблыневай ...олі баярышніцы, златагузкі, бяляна капусты, якія атакуюць палі і гароды

...нскі камсамол і Асоавіяхэм—на абарону сацыялістычнага ўраджаю

С'эканоміць 100 млн. руб.

...ртыяй і ўрадам адной з га-...ых баявых задач у трэці ...ючы год пяцігодкі пастаў-... падвышэньне ўраджайнась-...шых сацыялістычных палёў ...эднім на 9 проц., а ў саў-... да 20 проц. Каб выканаць ... задачу, трэба адначасова ...авядзеньнем шэрагу агра-...чных мерапрыемстваў, вя-... ўвагу зьвярнуць на аба-... ўраджаю ад нападу шкод-... і хвароб.

...СР з году ў год губляе ад ...най дзейнасьці розных ...ціножак, хвароб і грызуноў ...00 млн. руб. Каб забясьпе-... гаспадаркі ад такіх вялікіх ... і праводзіць сыстэматыч-...працу па змаганьні з імі, ...з арганізавана ўсесаюзнае ...наньне па барацьбе са ...нікамі і хваробамі ў сель-... гаспадарцы. Беларускае ...леньне, ці БелАБШ гэтага ...наньня, сваім прамфінпля-...прадугледжвае правядзеньне ...прыемстваў па барацьбе са ...нікамі на суму звыш 1 млн. ... што павінна захаваць ...жаю на 5—6 млн. рублёў. ...з у Віцебску арганізуецца ...нная зьнішчальная стан-...—МІС. Каб з большым пось-...м правесьці гэтую справу, ...ня даць магчымасьці розным ...нікам зьнішчаць наш ура-..., Асоавіяхэм, разам з ...БШ, абвясьціў месячнік ...цьбы са шкоднікамі.

...эба тэрмінова ўсім ячэй-... ЛКСМ і Асоавіяхэму ўклю-...а ў працу па разгортваньні ...ыхтоўчых зьнішчальных ме-...ыемстваў па барацьбе са ...нікамі і хваробамі сельскай гаспадаркі.

Ленінскі камсамол і члены ячэек Асоавіяхэму павінны ўзяцца за выкананьне плянаў барацьбы, павесьці шырокую арганізацыю дабраахвотных атрадаў па барацьбе са шкоднікамі, уцягваючы ў працу вучняў і піянэраў шляхам рэйдаў і ўдарных брыгад, праверыць на колькі гаспадаркі забясьпечаны машынамі-апрыскваценямі і апыліцелямі, рознымі атрутамі, ці заключаны ўмовы з МІС, ці вабясьпечаны сродкамі, рабочай сілай, ці праведзена прапалка гародаў і г. д.

Трэба ўзяць адстаючыя арганізацыі на грамадзкі буксір, правесьці мабілізацыю ўнутраных сродкаў барацьбы. Усе гэтыя пытаньні неабходна асьвятляць праз друк.

Улічваючы вялікі недахоп у кадрах барацьбітоў за захаваньне сацураджаю, урадам адкрываецца ў Віцебску навучальная ўстанова—Беларускі тэхнікум па барацьбе са шкоднікам ў сельскай гаспадарцы і па вывучэньню хэмічнай справы. У тэхнікум зараз распачаўся набор студэнтаў.

Камсамольскія і асоавіяхэмаўскія арганізацыі павінны выканаць пастаўленую перад імі задачу, забясьпечыць укамплектаваньне тэхнікуму лепшымі ўдарнікамі з камсамольцаў, калгасьнікаў і наогул бядняцка-серадняцкага актыву.

Усе члены ЛКСМБ і Асоавіяхэму, вучні, піянэры павінны быць у шэрагах дабрахвотных атрадаў па барацьбе са шкоднікамі.

П.

Шкоднікі сельскай гаспадаркі зьнішчаюць ураджай гародаў і садоў

Мэтэоролёгічныя ўмовы вясны і лета бягучага году добра спрыяюць размнажэньню шкоднікаў, галоўным чынам, саду і гароду.

Вытвараным абсьледваньнем віцебскай міжраённай зьнішчальнай станцыяй выяўлена, што ў саўгасах і калгасах садова-гароднія культуры і ўраджай ад іх пад пагрозай зьнішчэньня шкоднікамі: баярышніца, златагузка, ябланявая моль, плодажорка, капусная бялянка, соўка, лугавы матылёк, гарохавая зярноўка, бабануха і інш.—гэта галоўныя шкоднікі, якія заўважаны на садова-гародніх культурах саўгасаў і калгасаў.

Шкоднікі ўжо пачалі зьнішчаць ураджай, але гэта толькі першае пакаленьне іх, найбольшая пагроза ад другога пакаленьня, гэта канец ліпеня і жнівень месяцы. Машына-зьнішчальная станцыя ўжо ня раз папярэджвала аб гэтым гаспадаркі і ўстановы, кіруючыя імі, як: райкалгассаюз, ЦРК, плодагародніна і асабліва прыгарадныя гаспадаркі, каб пачаць працу па барацьбе са шкоднікамі ў момант іх зьяўленьня, бо калі шкоднікі размножацца, барацьба з імі будзе вельмі цяжкая і 40 проц. ураджаю саду і гароду, а таксама дрэў і расьлін можа быць зьнішчана.

Нягледзячы на ўсе заўвагі з боку дырэктыўных урадавых устаноў і віцебскай МІС наконт барацьбы са шкоднікамі, усё-ж саўгасы і калгасы, асабліва прыгарадныя, не зьвярнулі ўвагі на гэтую справу. Толькі каапгас «Новы сьвет», «Парыская камуна» і Янопаль, дзе кіраўнікі спэцыялістыя клапацяцца аб захаваньні ўраджаю, пачалі зьнішчаць шкоднікаў. У гэтых гаспадарках МІС апрацавана ўжо 52 га гароду і 19 га садоў.

Не дапушчаюць да працы МІС і самі не вядуць барацьбы каапгасы: імя Молатава, МОПР, Білева, «Новы шлях», кіраўнікі якіх і спэцыялістыя лічаць, што шкоднікаў на садова-гародніх культурах няма, між тым у гэтых гаспадарках як раз заўважан лугавы матылёк, яблыневая моль—біч садова-гародніх культур.

Райкалгассаюзу, ЦРК і іншым установам трэба зьвярнуць асаблівую ўвагу на ахову ўраджаю, прымусіўшы саўгасы, калгасы і прыгарадныя гаспадаркі тэрмінова прыступіць да барацьбы са шкоднікамі, інакш справа будзе дрэнная. Ураджай 1932 г. залежыць ад таго як будзе праведзена барацьба са шкоднікамі ў 1931 г.

Зараз праходзіць месячнік па барацьбе са шкоднікамі, трэба ўсім прыняць ўдзел у гэтым месячніку, каб зьнішчыць шкоднікаў, асабліва павінен прыняць удзел гарсавет Асоавіяхэму, які да гэтага часу яшчэ не распачаў працу. Агроном Макееў.

Змагацца са стратамі

Розныя шкоднікі і хваробы прыносяць сельскай гаспадарцы вялікія страты, вылічваемыя ў некалькі дзесяткаў мільёнаў руб. у год шляхам пажыраньня і псаваньня расьлін. Адной з спрыяючых умоў для разьвіцьця шкоднікаў зьяўляюцца сарнякі, якія засьмечваюць палі і гароды. Сарнякі даюць першы прытулак і ежу для шкоднікаў. Толькі на сарняках спачатку разьвіваецца большасьць шкоднікаў, на іх большасьць шкоднікаў адкладвае яечкі, з якіх праз некаторы час выходзяць маленькія чарвячкі; тутака яны спачатку кормяцца, знаходзяць сабе спажыву. Потым, як падрастуць, яны пачынаюць распаўзацца і нападаць на культурныя расьліны.

Каб забясьпечыць гародніну ад зьнішчэньня шкоднікамі, трэба зараз-жа ўзяцца за хутчэйшае правядзеньне ў чыстату нашых гародаў, бо калі спазьніцца з прапалкай, шкоднікі распаўзуцца і нападуць на гароды.

Выпалатыя сарнякі трэба зьнішчаць, ці скарыстаць на кампосную кучу ці на сілос, бо калі не зрабіць гэтага своечасова, то шкоднікі, якія знаходзяцца на расьлінах, могуць распаўзьціся на гароднія расьліны.

Неабходна тэрмінова правесьці прапалку гародаў і гэтым абараніць іх ад нападу шкоднікаў і захаваць ураджай.

М. П.

Абаронім палі і гароды

...рыяючыя ўмовы гэтага лета паказваюць, што магчыма ...а чакаць двух шкоднікаў—...на-капусьніка і соўкі-гамы. ...вы шкоднікі зьнішчаюць га-...ія расьліны, у пераважнась-...рыжыкавыя, а соўка-гама ...т буракі, гарох і іншыя.

...лян-капусьнік у дарослым ...ядзе — матыль з белымі ...ьлямі, удзень ён адкладвае ... жоўценькія яечкі на лістох ...сты кучкамі. Праз некалькі ... з яечак выходзяць малень-...вусянічкі, якія спачатку жы-... грамадой, а падросшы рас-...аюцца і кормяцца. У гэты ...яны прыносяць шмат стра-...аб'ядаючы і зьнішчаючы ...ліны. Вусені дасягаюць 4—... сінявата-зялёнага колеру ...рнымі кропкамі і жоўтымі ...скамі па бакох і сьпіне.

...угі шкоднік—вусені соўкі-... Зьяўленьне яго трэба ча-... у бліжэйшыя часы. Шко-... вусень амаль усім расьлі-... гародаў. Соўка-гама ў да-...ым выглядзе—матыль з бу-...намонавым колерам крыль-... На пярэдніх крыльлях зна-...зяцца серабрыстыя плямкі. ...слы вусень дасягае паме-... 2—3 см., зялёнага колеру, ...бакох цела цягнуцца сьветлыя бледна-жоўтыя палосы. Цела пакрыта чорнымі барадавачкамі. Вусені рухаюцца, выпячваючы сьпіну ўверх, што зьяўляецца добрай прыкметай для адрозьніваньня ад іншых шкоднікаў. Пажыраюць вусені амаль усе гароднія расьліны.

Меры барацьбы са шкоднікамі наступныя: 1) **зьнішчэньне сарнякоў шляхам прапалкі гародаў; 2) раздушваньне кладак яечак бяляна-капусьніка; 3) раздушваньне маладых вусеняў бяляна-капусьніка ў час пасьля выхаду іх з яечак; 4) апрысваньне расьлін унутранымі атрутамі—парыскай зеленьню з адгашанай вапнай.**

Зараз наглядаецца некаторы недахоп атрут, пагэтаму ў першую чаргу трэба зьвярнуць увагу на раздушваньне кладак яечак бяляна-капусьніка, мабілізаваўшы для гэтае працы вучняў і піянэраў. Раздушваньне кладак яечак, ці маладых вусеняў, трэба праводзіць разы 2—3 з перапынкам у 3—4 дні.

Камсамол, калгасная моладзь, вучні, піянэры, члены Асоавіяхэму—усе на барацьбу са шкоднікамі! Не дамо папсаваць ніводнага га гародніны!

М. Пілько.

Сустрэнем хлеб з падрыхтаванай тарай

Уборачная кампанія патрабуе асаблівай увагі. Адно з першых месц у гэтай кампаніі належыць збору мяккай тары—мяхоў. Калі мы хлеб убярэм, а хаваць яго будзе некуды—дык гэта будзе толькі палова работы.

З мінулага году па ўсіх гарадох Беларусі арганізаваны рамонтна-тарныя базы, у тым ліку і ў Віцебску. У гэтай базе сканцэнтравана ўся тара, на базе ўсімі ўстановамі здаюцца ўсе мяхі і іншая тара, а адсюль усе ўстановы і прадпрыемствы забясьпечваюцца тарай.

Там-жа вытвараецца і рамонт мяхоў.

Ня гледзячы на пастановы і распараджэньне ўраду аб здачы мяхоў на базу, да гэтага часу ніякага зруху ў гэтым напрамку ня маецца. Наадварот у ЦРК лік мяхоў з кожным днём павялічваецца. Мяхоў у ЦРК—46.633 шт.

Неабходна зараз-жа прадпрыемствам і ўстановам здаць усе мяхі, каб сустрэць уборачную кампанію з падрыхтаванай тарай, а зрыўшчыкаў гэтага важнага мерапрыемства прыцягнуць да адказнасьці.

Б.

...апамагчы камуне „Іскра Ленінская"

...амунары камуны «Іскра Ленінская», з прычыны недахопу ...очых рук на 4830 працадзён, ...очваюцца ў першую чаргу ...ваіх шэфствуючых арганіза-... аб аказаньні ім дапамогі ў ...ечасовай уборцы сенажаці і збожжа.

Мы ўпэўнены, што шэфствуючыя арганізацыі дапамогуць камунарам, моцна трымаючым у сваіх руках сьцяг Леніна, ліквідаваць гэты прарыў.

Дзэхцяроў.

...алгасьніку з папом не па шляху

...Замастоцкім сельсавеце ўвясну ... арганізаван калгас з былой ...Стрыганы ў ліку 31-й гаспадаркі з ...га зямлі. Уся вясновая запашка ...одзілася па-ударнаму. На сёньні ...і дзень калгас сябе апраўдвае. ...ж ёсьць такія калгасьнікі, якія ...ачную кампанію зрываюць сваёй ...сцыплінаванасьцю. У дзень рэ-...ных сьвят Янкі Купала ў самы ...ар працы ўсе калгасьнікі выхо-...ь на поле, а **Скутаў Цімахвей** лічыць мэтазгодным запрэгчы без дазволу каня, забраць сваю сям'ю і паехаць на паўдня за 6 клм. у царкву, што выклікала абурэньне з боку другіх калгасьнікаў.

Неабходна зьнішчыць гэтыя недахопы. Трэба ўразумець тую шкоднасьць, той дурман, які нясе за сабою рэлігія і раз назаўсёды адкінуць усялякія рэлігійныя забабоны. Калгасьніку з папом не па шляху.

М. Галубцоў.

...апоўскія служкі шкодзяць калгаснай працы

...Замастоцкім сельсавеце ёсьць ...ква Скрыдлёва. Нягледзячы на ... што ў гэтым сельсавеце вялі-... частка насельніцтва калекты-...вана, ёсьць частка калгась-...ў, якая дапамагае папоў-...е хэўры ў шкодніцтве ўбо-...най кампаніі. У калгасе ...сьце» пражываюць калгасьнікі ...ты Іванова, якія падтрымліва-... папа і вядуць сярод на-...ніцтва розную папоўскую ...ацыю. З іх Іваноў Мікола—...ы афіцэр царскай арміі пяе ...клірасе ў царкве. Калі кал-... «Вусьце» на агульным сходзе ...танавіў на рэлігійнае сьвята ...алы працаваць—праводзіць ...ку і ўборку для сенажаці, дык папоўскі прыслужнік Іваноў Мікола сарваў уборку і пайшоў у царкву. Яго жонка не састаіць членам калгасу і вядзе разлагаючую працу сярод насельніцтва. Калгасу неабходна выгнаць са сваіх шэрагаў Іванова Міколу—былога афіцэра, папоўскага прыслужніка, зрыўшчыка ўборачнай кампаніі. Трэба ў час правядзеньня месячніка генэральнай праверкі калгасу «Вусьце» дасканала перагледзець свае шэрагі, каб правесьці ўборачную кампанію па баявому і сустрэць восеннюю сяўбу ва ўсеузбраеньні, ліквідаваўшы маючыяся недахопы.

М. Галубцоў.

Сенаўборку скончылі ўдарна

Ліквідаваць прарыў у сіласаваньні

Калгас «Беларуская вёска» ў асноўным спраўляецца з заданьнямі і дырэктывамі партыі і ўраду, выконвае ў прызначаныя тэрміны ўборачныя работы. **Дзякуючы добраму кіраўніцтву і правільнаму разьмеркаваньню сіл, сена датэрмінова ўбрана. На 18 ліпеня ўбрана плошча лугу ў 80 га, накошаны першага пакосу 46 га.**

План работы калгасу на ўвесь пэрыяд ўборачных работ даведзен да кожнай брыгады і калгасьніка. Напярэдадні ўборачных работ у калгасе праведзена некалькі гутарак сярод калгасьнікаў аб задачах, што стаяць перад калгасьнікамі ў пэрыяд ўборачных работ. Брыгады паміж сабою спаборнічаюць, калгас выклікаў на сацспаборніцтва калгас **«Віцебскі пралетары»** на пасьпяховае выкананьне ўборачных работ і лепшую якасьць іх. Жаночая праца арганізавана па-брыгадна. Прапалка праходзіла своечасова.

Калгас улічыў вялікае значэньне ўборачных работ і своечасова падрыхтаваў маючыся інвэнтар. Абязьлічка ліквідавана. Кожны калгасьнік адказвае за сваю машыну, а таксама і за каня.

Калгасьнік пры выезьдзе на работу атрымлівае інвэнтар ад загадчыка гаспадаркай пад расьпіску. Пасьля сканчэньня работы ідзе агляд становішча інвэнтару і ў выпадку паломкі складаецца акт, які разглядаецца на праўленьні калгасу. Калі ўстаноўлена паломка па віне калгасьніка, дык каштоўнасьць паломкі вылічваецца з заробку.

Па сіласаваньні калгас ня выканаў урадавага заданьня к прызначанаму тэрміну. Старшыня праўленьня калгасу завярае, што пры актыўным удзеле калгасьнікаў у бліжэйшы час заданьне будзе выканана.

Калгасу «Беларуская вёска» трэба ліквідаваць свой прарыў па сіласу.

Шлапакоў.

Зрыўшчыкаў работы гарсавету да адказнасьці

Разгортваньнем сацспаборніцтва і ўдарніцтва забясьпечым выкананьне сацдагавору з Менскім гарсаветам

Палажыць канец зрывам працы гарсавету на вытворчасьці

Наблізіць апарат гарсавету, увесь гарсавет да мас, тварам да вытворчасьці—асноўная задача ў справе перабудовы працы гарсавету.

Як адзін з мэтадаў набліжэньня яго да мас, прэзыдыум гарсавету праводзіць прыймовыя дні непасрэдна на вытворчасьці,—выязныя паседжаньні прэзыдыуму на фабрыках і заводах, для разгляду пытаньняў, зьвязаных з жыцьцём прадпрыемства. Вядома, ня ў гэтым толькі справа перабудовы работы гарсавету. Але і гэтыя, к таму-ж досыць папулярызаваныя на старонках нашай газэты мерапрыемствы, мы ня можам ажыцьцявіць як належыць.

Зрывы прыёмаў на вытворчасьці ўвайшлі ў сыстэму і, відаць, у нас, у Віцебску, лічуцца нармальнымі. Нажаль, маюцца выпадкі, калі прыёмы зрываліся з-за няяўкі прадстаўнікоў гарсавету (такіх выпадкаў было 3, вінаватыя перададзены ў гарКК). Галоўныя-ж прычыны зрыву—непадрыхтаванасьць да гэтага самой рабочай масы з боку фабзаўкомаў, адсутнасьць ня толькі папулярызацыі гэтых прыёмаў, а нават належнай інфармацыі сярод рабочых аб тэрміну і месцы маючага быць прыёму (апошні выпадак 14-га ліпеня на панчошнай ф-цы, дзе на прыём у вызначанае месца на ф-цы не зьявілася ніводнага рабочага).

Ня лепш абстаіць справа і з выязднымі паседжаньнямі прэзыдыуму.

Сарваны паседжаньні на ф-цы «Дзьвіна», на лесзаводзе № 13 у віду поўнай адсутнасьці на паседжаньнях рабочых гэтых прадпрыемстваў, а даклад дырэкцыі фанэрнага заводу адбыўся ў прысутнасьці ня больш аднаго дзесятку рабочых заводу.

Усё гэтае—вынікі безадказных адносін з боку ФЗМК да справы павароту гарсавету тварам да вытворчасьці, да рабочых мас, да справы ўцягненьня гэтых мас у непасрэдную працу саветаў.

З гэткімі зьявішчамі трэба павесьці рашучую барацьбу і раз назаўсёды палажыць ім канец. Канкрэтныя вінаваўцы ў зрыве прыймовых дзён павінны быць прыцягнуты да адказнасьці.

Пракопенка.

Прысутнічала толькі 200 чал.

Справаздачу гарсавету ў садзе імя Леніна для рабочых фабрыкі «Сьцяг індустрыялізацыі» рабіў т. Варкін. Галоўную ўвагу ў дакладзе т. Варкін застанавіў на пытаньні росту прамысловасьці гораду, а таксама на прарыве ў выкананьні прамфінпляну, які маецца ў большасьці буйных прадпрыемстваў гораду, прычым казаў, што гарсавет мала ўдзяляў увагі гэтаму пытаньню. Застанаўляючыся на пытаньні забесьпячэньня, тав. „Варкін казаў, што дагэтуль гарсавет не дабіўся перабудовы працы каапэрацыі на падставе звароту ЦК УсеКП(б), СНК і Цэнтрасаюзу. Каапэрацыя не павярнулася тварам да прамфінпляну.

Выступаўшыя ў спрэчках таварышы адзначылі буйныя недахопы ў рабоце гарсавету (ня скончана ў тэрмін будаўніцтва лазьні, панчошнай фабрыкі, бальніцы і г. д.). Адзначылі, што гарсавет нічога не зрабіў для палепшаньня працы каапэрацыі. Ад дэлегацыі, прысутнічаўшай на сходзе ад ленінградзкай швэйнай фабрыкі імя т. Валадарскага у спрэчках выказаўся т. Пячонкін. Бурнымі воплескамі сход прыняў паведамленьне т. Пячонкіна аб сканчэньні фабрыкай т. Валадарскага свайго прамфінпляну ў два з паловай гады. Далей т. Пячонкін казаў, што арганізацыі фабрыкі зварочваюць шмат увагі на работу гарсавету. „Мы прыехалі сюды—кажа т. Пячонкін—для таго каб, перанесьці наш вопыт на вашу фабрызу і ўзяць у вас усё лепшае, што ў час яшчэ ня зроблена".

Сход скончыўся прыняцьцем рэзалюцыі, па якой рабочыя фабрыкі ўзялі на сябе шэраг абавязкаў у сэнсе дапамогі працы гарсавету. На гэтым-жа сходзе рабочыя фабрыкі «Сьцяг індустрыялізацыі» прынялі выклік рабочых заводу «Чырвоны мэтал ст» аб абвяўленьні дэкадніка дапамогі грамадзянскаму паветранаму флёту ў памяць загінуўшых лётнікаў.

Трэба адзначыць, што на сходзе прысутнічала толькі 200 чал., у той час калі ў гэты дзень на прадпрыемстве было ня занята больш 800 рабочых.

Наум Абезгаўз.

Сьпіс членаў і кандыдатаў гарсавету, адсутнічаўшых на паседжаньнях пленумаў сэкцый 9 і 19 ліпеня

Бытавая сэкцыя:

Белякова, Каган, Крэслаўская, Скабло, Кулакоў, Гаравецкі, Каган, Ключ, Самерсаў, Іваноў, Макарава, Наўроцкая (9-га ліпеня), Белякова, Бараноўская, Войнава, Віленчык, Дук, Іваноў, Карнілава, Камель, Наўроцкая, Скабло, Самерсаў, Шмэйдэрман, Якубоўская, Яцэвіч і Буякоў (19-га ліпеня) і на ўнечарговым пленуме сэкцыі адсутнічалі: Войнава, Іваноў, Наўроцкая, Скабло, Самерсаў, Якубоўская, Яцэвіч і Буякоў.

Прамысловая сэкцыя:

Агееў, Бель, Варкін, Грэтунь, Гурэвіч, Гуткіна, Дыменштэйн, Дудакоў, Крэндзель, Капышка, Курдзюк, Лядзенкоў, Пазьнякоў, Палікарпаў, Панфіловіч, Рубінштэйн, Рашаль, Рачкоўскі, Рудакоў, Савіцкая, Скутэльскі, Фішэр, Фрыд, Цярэшчанка, Шамера, Шаўцоў, Зьмітрова і Лобзікаў (9-га ліпеня), Бель, Варкін, Гадаскіна, Гуткін, Дыменштэйн, Драгілеў, Зарэцкі, Крэндзель, Капышка, Курдзюк, Лейбовіч, Леднякоў, Палікарпаў, Пятроў, Панфіловіч, Рубін, Рашаль, Рачкоўскі, Рудакоў, Савіцкая, Скутэльскі, Ходзікаў, Цярэшчанка, Шамера, Шмэй, Шаўцоў, Зьмітрава, Плавінскі, Лобзікаў (19-га ліпеня).

Гандлёва-каапэрацыйная сэкцыя:

Аксельрод, Багданаў, Бучынскі, Бабінаўскі, Вульфовіч, Грыбава, Дворына, Еўрэйсон, Казюлева, Лахін, Пятун, Макараў, Бальцэровіч, Печын, Пятроў, Сьцяпсон, Хайкін, Цыганоў, Цал (9-га ліпеня), Аксельрод, Баранава, Багданава, Бучынскі, Вульфовіч, Грыбава, Дзоркіна, Еўрэйсон, Іванова, Казулева, Лаўфін, Пятун, Макараў, Бальцэровіч, Печань, Пятроў, Рышкус, Сьцяпсоў, Хайкін, Плавінскі, Карасёў, Мажарава, Нікіція, Міхаўлаў, Ваўчок (19-га ліпеня).

РСІ:

Белісаў, Віткоўская, Грыгор'еў, Жыгалін, Сіпельнікаў, Сякін, Скарына, Шаляміс, Шаўская, Яравой, Картузаў, Лосеў, Далгіла, Фэйзераў, Палудніцкі, Карташоў, Каган, Крэчаў, Ліўшыц, Махначоў і Пушкова (9 ліпеня).

Працы і забясьпекі:

Фрыдман, Пушкарскі, Касёнак, Казлоў, Соскін (19 ліпеня).

Астатнія сэкцыі зьвесткі аб незьявіўшыхся не прадставілі.

Кіруючы друк—глыбей у масы

Слова за сэкцыямі гарсавету

Мы неаднаразова пісалі аб тым, што на паседжаньні Віцебскага гарсавету яшчэ 8-га студзеня г. г. быў прыняты выклік Менскага гарсавету аб шырокім распаўсюджваньні газэт «Известия» і «Савецкая Беларусь», а таксама і тое, што сэкцыі гарсавету абгаварылі гэтае пытаньне і прынялі на сябе абавязак у найкарацейшы тэрмін завербаваць максімальную колькасьць падпісчыкаў на гэтыя газэты, пад лёзунгам: «ніводнага члена гарсавету і прымацаванага да сэкцый актывістага без газэты «Известия» і «Савецкая Беларусь».

Трэба адзначыць, што гэтаму сур'ёзнаму пытаньню не надана належнай увагі і абяцаньні, узятыя на сябе членамі гарсавету, засталіся ня выкананымі. Для кіраўніцтва працай па падпісцы і для сувязі з прадстаўнікамі памянёных газэт, была рашана вылучыць у кожнай сэкцыі адказнага за гэтую працу. Гэтага таксама ня зроблена. Стала быць, выклік Менскага гарсавету мы прынялі, а выконваць яго і ня зьбіраліся.

Што трэба зараз-жа зрабіць?

Сэкцыі гарсавету павінны на першым-жа сваім пленуме зноў абгаварыць гэтае пытаньне ў напрамку высьвятленьня, якія вынікі кожная з іх мае на сёньняшні дзень у сэнсе распаўсюджваньня сярод сваіх членаў і актывістых газэт «Известия» і «Савецкая Беларусь»; тут-жа на пленуме правесьці падпіску сярод тых, якія гэтых газэт ня выпісваюць; выходзячы з прынятага ўжо абавязацельства, кожнаму члену гарсавету, на працягу бліжэйшай дэкады, правесьці вакол гэтага пытаньня належную растлумачальную працу сярод рабочых у цэху і служачых па ўстановах і завербаваць новых падпісчыкаў; вылучыць свайго прадстаўніка для паўсядзённай, сталай сувязі з прадстаўнікамі газэт, альбо непасрэдна з рэдакцыямі гэтых газэт па пытаньні падпіскі, а таксама асьвятляць на старонках гэтых газэт працу сэкцый і дэпутацкіх груп; разгарнуць сацспаборніцтва паміж сэкцыямі і дэпутацкімі групамі на падпіску.

Газэты «Известия» і «Савецкая Беларусь», якія рэгулярна зьмяшчаюць кіруючы матарыял па ўсіх пытаньнях і шырока асьвятляюць пытаньні савецкага будаўніцтва, павінны чытаць усе члены гарсавету, увесь савецкі актыў.

У мандатнай камісіі гарсавету

Мандатная камісія гарсавету на сваім паседжаньні ад 22-га ліпеня 1931 г. перавяла з кандыдатаў у члены гарсавету тт.: **Гайдарына** (рабіс) і **Дудакова** (ф-ка Лекерта).

Член гарсавету, старшыня дэпутацкай групы панчошнай фабрыкі імя Клары Цэткін Іваноў (аб якім пісалася ў газэце «Віцебскі пралетары») за супраціўленьне рацыяналізатарскім мерапрыемствам на фабрыцы, што выразілася ў дэманстрацыйным уходзе з працы, калі Іваноў на працягу цэлага дня не працаваў—**зьняты з пасады старшыні дэпутацкай групы і выключан са складу гарсавету.**

Член гарсавету т. Скудзельскі за сыстэматычнае ненаведваньне паседжаньняў сэкцыі і за катэгарычную адмову ў далейшым прыняць актыўны ўдзел у рабоце гарсавету, **выключан са складу гарсавету і справа аб ім перадана ў гарКК.**

Член гарсавету т. Іванова (панчошная ф-ка) за сыстэматычнае ненаведваньне пленумаў сэкцый (як член бюро фінансавай сэкцыі яна не зьявілася на пленум сэкцый 9-га ліпеня і пленум сэкцый быў сарваны)—**выключана са складу гарсавету і справа аб ёй перадана у гарКК.**

Старшыня фінансавай сэкцыі т. Эстрын, які пры ад'езьдзе ў адпачынак не паведаміў бюро і ня вылучыў намесьніка, што выклікала зрыў працы сэкцыі ў той час, калі грашовая сэкцыя павінна адыграць вялікую ролю ў распаўсюджваньні пазыкі «Трэці рашаючы»—пастановай мандатнай камісіі **зьняты з работы старшыні фінансавай сэкцыі з абвяшчэньнем суровай вымовы і перадачай справы ў гарКК.**

—о—

За непрадстаўленьне зьвестак вымова

Старшыням сэкцый гарсавету т.т. **Карлаву** (вайсковая,) **Сабалеўскаму** (камунальная), **Быкаву** (адміністрацыйна-прававая) і сакратарам сэкцый працы і забясьпекі т.т. **Мілаевай** і **Шчадрынскаму** (грашовая) за непрадстаўленьне зьвестак аб незьявіўшыхся на пленумы сэкцый 29-га чэрвеня, 9 і 19 ліпеня т. Мілаевай за непрадстаўленьн зьвестак 29-га чэрвеня абвешчана вымову.

Мандатная камісія папярэджвае ўсіх старшынь сэкцый пад іх асабістую адказнасьць, зараз-жа прадставіць зьвесткі аб адсутнічаючых.

Мандатная камісія Віцгарсавету.

Калгас „1 мая" ў глыбокім тыле

Да 1 жніўня давесьці да кожнага калгасьніка парадак разьмеркаваньня прыбыткаў

Калгас «1-га мая» адзін з буйнейшых у Старасельскім сельсавеце вясновы сеў правёў па-ўдарнаму і пляны ў некаторай частцы перавыканаў. У калгасе былі ўсе магчымасьці ўдарна правесьці сяўбу і ёсьць усе магчымасьці ўдарна сабраць ураджай. Машынамі калгас забясьпечан поўнасьцю, але ўдарных тэмпаў у ўборцы ўраджаю яшчэ няма, маюцца прарывы.

У калгасе слабая працдысцыпліна, недавыкананьне па некаторых галінах працы норм, асабліва па сенажаці. Большасьць калгасьнікаў яшчэ не ўявілі сябе сутнасьць зьдзельшчыны; да кожнага калгасьніка нормы выпрацоўкі не даведзены. Па большасьці аддзяленьняў, якіх у калгасе налічваецца 14, выявілася, што калгасьнікі ня ведаюць як ім запісвае брыгадзір іх працу. Напрыклад, у аддзяленьні Кавалькі, калі ў брыгадзіра Ляхоўскага калгасьнікі запыталіся, колькі яны выпрацавалі і як улічана праца, Ляхоўскі адказаў: «гэта вайсковая тайна». Амаль такое-ж становішча і ў іншых аддзяленьнях калгасу. Працоўнымі кніжкамі ня кожны калгасьнік забясьпечан. Не хапае табеляў і вучот вядзецца на кавалках паперы. Праўленьне да зьнішчэньня гэтых ненармальных зьявішчаў меры ня прыняла. Пяцідзённьнік уліку працы ў калгасах прайшоў дрэнна. Ні гарком партыі, ні гарком КСМ, ні гарсавет гэтым пытаньнем, як сьлед, не заняліся, у той-жа час улік працы ў калгасе пастаўлен вельмі дрэнна.

Сацспаборніцтва і ўдарніцтва тут не ў пашане. Камсамольская ячэйка гэтым пытаньнем не занялася. У калгасе лічыцца 240 ударнікаў, але большасьць толькі на паперы. Вучоту эфэкту ўдарніцтва няма. Праца ўдарнікаў нікім і ніколі не правяралася. Прэміраваньня за лепшую працу ня было, а ўдарна-працуючыя калгасьнікі ёсьць. Фонд прэміраваньня не скарыстоўваецца.

Праўленьне няздольна правільна раставіць сілу на ўсіх участках працы. У аддзяленьні калгасу „Лукі" на 40 га сенажаці пастаўлена тры касцы.

Да восеннага севу калгас ня рыхтуецца. На зьлёце брыгадзіраў выявілася, што паасобныя аддзяленьні скончылі ўспашку на азіміну, у некаторых гэтая праца ідзе марудна з-за адсутнасьці плугоў. Напрыклад, аддзяленьне Хвастова аддало ў рамонт у калгасную кузьню 15 плугоў, але ўжо мінула паўтара месяцы, а плугі ўсё не адрамантаваны.

Культпраца адсутнічае. Праўленьне калгасу нават ня выпісала для калгасьнікаў ніводнага экзэмпляра газэт. Падвозка абедаў на поле не практыкуецца.

Трэба зараз-жа пакончыць з самацёкам у працы па падрыхтоўцы да ўборачнай і восеннага севу, укараніць зьдзельшчыну ва ўсе віды работ. Не пазьней 1-га жніўня кожны калгасьнік павінен ведаць прыкладнае разьмеркаваньне прыбыткаў. Неарганізаванасьці ў працы трэба пакласьці канец.

Бав. Паўночны.

УЗНЯЦЬ ЯКАСЬЦЬ РАБОТЫ МОПРАЎСКІХ АРГАНІЗАЦЫЙ

Раўняйцеся па „Сьцягу індустрыялізацыі"

Мопрпраца на швэйнай фабрыцы «Сьцяг індустрыялізацыі» узьнікла зараз-жа пасьля пуску фабрыкі, у пачатку сакавіка месяца, але ня гледзячы на гэты невялікі тэрмін, у гэтай галіне працы ёсьць цэлы шэраг дасягненьняў.

У сучасны момант мопрарганізацыя там налічвае 60% усіх рабочых, альбо 1950 чал. Запазычанасьць па членскіх узносах паменьшэна ліквідуецца, нават ёсьць выпадкі, калі рабочыя ўносяць членскія узносы ўперад за ўвесь 1931 г., маецца ўдарны мопраўскі гурток, па ўсіх цэхах маюцца мопраўскія плякаты і лёзунгі. Мопрактыў фабрыкі складаецца з 58 асоб.

Трэба адзначыць, што тут даволі добра пастаўлена інтэрнацыянальна-выхаваўчая работа, праводзяцца гутаркі, распаўсюджваецца мопрлітаратура, праведзены 2 масавых інтэрнацыянальныя вечары ў клюбе швэйнікаў. Мопржурналаў па фабрыцы выпісваецца 1500 экз.

Мопраўцы «Сьцягу індустрыялізацыі» актыўна ўдзельнічаюць у барацьбе за прамфінплян і імі арганізаваны 3 ударных брыгады імя «Парыскай камуны», якія ахопліваюць 110 чал. Гэтыя брыгады ідуць упераджэ па выкананьні прамфінпляну, выканаўшы яго за красавік і май у сярэднім на 103—104%. Нядаўна арганізавана яшчэ адна брыгада імя 3-га зьезду МОПР. Мопрарганізацыяй разгорнута праца па збору сродкаў на пабудову інтэрнацыянальнага дому для дзяцей палітзьняволеных.

Трэба адзначыць, што партыйны калектыў фабрыкі дапамагае рабоце мопрарганізацыі. Так, парткалектывам вылучаны на мопрпрацу добрыя працаўнікі, як: Ельсон, Гітлін, Янавіцкі і інш. На раду з гэтым маюцца і некаторыя недахопы, якія патрэбна зараз-жа выжыць.

Да ліку апошніх трэба аднесьці тое, што яшчэ не па ўсіх цэхах добра пастаўлена мопрпраца, ня ўсе рабочыя ахоплены мопрарганізацыяй, недастаткова праводзіцца сацспаборніцтва паміж ячэйкамі МОПР.

Прыклады мопрпрацы на «Сьцягу індустрыялізацыі» яскрава кажуць аб тым, што пры жаданьні магчыма шырока разгарнуць гэтую працу і, там, дзе яна не разгорнута, гэта нельга інакш тлумачыць, як апартуністычнымі адносінамі да гэтай працы.

Армін і Ударны.

Ажывіць працу рэўкамісій ячэек МОПР

У абавязак рэўкамісій пры ячэйках МОПР'у ўваходзіць ня толькі праверка грашовых спраў, але і праверка ўсёй працы ячэек, як па збору сродкаў, інтэрнацыянальнаму выхаваньню, удзелу ячэйкі ў сацбудаўніцтве і г. д., але трэба казаць, што на сёньняшні дзень большасьць рэўкамісій на прадпрыемствах толькі лічыцца на паперы, носіць гэта гановае найменьне і нічога ня робіць. Такім прыкладам могуць служыць рэўкамісіі на **заводзе «Чырвоны металіст», штотачнай фабрыцы, белгасбудзе, панчошнай фабрыцы і інш.**

У зьвязку з гэтым магчымы злоўжываньні, растраты і галоўнае паслабляецца наогул праца ячэйкі.

Партыйныя і прафарганізацыі фабрык, заводаў і ўстаноў павінны павесьці рашучую барацьбу за ажыўленьне працы рэўкамісій і наогул працы ячэек МОПР.

Армін.

У вэтмузэі

Вэтэрынарна-зоолёгічны музэй за паўгода з 1-і да 1-VII наведалі экскурсіі сялян-калгасьнікаў, рабочых, чырвонаармейцаў і вучняў 227, у колькасьці 7849 чал. Паасобных наведвальнікаў 8324, усяго наведала музэй 16173 чал. Экскурсіі сапраждаліся лекцыямі. Антырэгійных лекцый праведзена 51.

Музэй выносіць падзяку прафэсарам і выкладчыкам вэтінстытуту, якія правялі значную лекцыйную працу за гэты час: Арнольдаву М. А., Барадзёнак А. І., Вараб'ёву М. А., Вольферцу В. Ю., Гарагляду Х. С., Дзямідзёнка І. Я., Знаменскаму А. А., Міхнюку, Макавейскаму В. І., Неклепаеву І. А., Старшынскаму, Фдораву, Цуркану І. І., Шчэрбаву Ф. П., Герасімовічу П. А., Бярозаўцу Г. І.

З прычыны рамонту з 10-VII па 10-VIII музэй будзе зачынен.

К 1 жніўня скончыць будаўніцтва

Пастановай віцебскага гарсавету ад 19 ліпеня, з 20 па 30 ліпеня праводзіцца дэкаднік штурму па ліквідацыі прарыву на дарожным будаўніцтве. Па Старасельскім сельсавеце дарбудаўніцтва правалена з-за няздбайных адносін да гэтай важнай справы з боку сельсавету. Абвешчаны дэкаднік штурму павінен даць належны зрух у гэтай галіне працы з тым, каб к 1 жніўня поўнасьцю скончыць дарбудаўніцтва і прыступіць па ударнаму да ўборкі ўраджаю і восеннай сяўбы.

Брыгада:
Пламенны і Прамень.

Самазабесьпячэньне працягваецца

Некалькі разоў ужо пісалі аб тым, што на 7-й дарожнай дыстанцыі існуе безгаспадарчасьць і самазабесьпячэньне прамтаварамі, але гэта зьявішча ня зьнішчана і працягвае існаваць. Так, з прысланай для рабочых-ударнікаў мануфактуры адміністрацыя, бяз ведама рабочкому, забрала сабе 15 мэтраў аксаміту і па 10 шт. насавых платкоў.

Пара ўжо пакласьці канец гэтакім зьявішчам. Ад паведныя арганізацыі павінны рашуча ўдарыць па тых, хто займаецца самазабесьпячэньнем прамтаварамі і зрывае ўдарную працу на дарожным будаўніцтве.

Ч.

Дапамагае разбазарваньню дэфіцытных тавараў

8 га красавіка міліцыянер 3-га аддзяленьня міліцыі **Мураўёў**, зайшоў у магазын па Вакзальнай вуліцы № 36 з мэтай атрымаць там ватовую тужурку, і заўважыў, што заўмаг адпускае без паявой кніжкі тужурку прыказчыцы пасуднага магазына Сулікавай. Мураўёвым Сулікава і заўмаг былі затрыманы і дастаўлены у 3-е аддзяленьне міліцыі да начальніка тав. Хэйфеца.

Апошні, замест таго каб дэталёва высьветліць гэтую справу і паведаміць аб пратэкцыянісцкіх дзеяньнях заўмага праўленьня ВЦРК, адпусьціў яго і сказаў Мураўёву каб ён у другі раз «ня ўмешваўся ў гэткія справы, бо гэта да яго не датычыцца, а справа самаго заўмага».

Праўленьне ЦРК і гарміліцыя павінны зацікавіцца гэтай справай і прыцягнуць вінаватых да адказнасьці.

М. Г.

Будаўніцтва біофабрыкі праходзіць бяз пляну.

На будаўніцтве біофабрыкі рабочага пляну нема. Кіраўніцтва ўсёй работы праводзіцца габінэтна. Пра вытворчыя нарады зусім забыліся, з-за чаго будаўніцтва праходзіць марудна. Пабудаваныя баракі для рабочых зроблены дрэнна, дах цячэ, падлогі прышлося перарабляць, што абышлося ў 600 руб. Рабочком бязьдзейнічае. Культурна-масавая праца адсутнічае. Сацспаборніцтва і ўдарніцтва не праводзіцца.

Адпаведныя арганізацыі павінны зацікавіцца работай на пабудове і зрабіць вывады наконт тых, хто стварае дрэнныя ўмовы на будаўніцтве.

Казаноў Алесь.

„Цяпер такі фасон"...

За ўвесь час існаваньня закрытай пачынначай майстэрні швэйнікаў зьмянілася ўжо тры інструктары. **Трэць цякоў**, які зараз працуе інструктарам, дрэнна адносіцца да справы. Сам ён па спэцыяльнасьці не шавец і ў гэтай галіне нічога не разумее. Якасьць пачынкі абутку на апошні час пагоршылася. На заўвагі рабочых аб дрэннай якасьці пачынкі, Трэць цякоў адказвае: **«цяпер такі фасон»**.

Адпаведныя арганізацыі павінны на гэта рэагаваць. Трэць цякоў ня можа заставацца інструктарам.

Неабходна даць кваліфікаванага інструктара, які-б змог паставіць працу майстэрні на належную вышыню.

Рабочы.

Перадаць трубы будаўніцтву

Яшчэ ў 1929 г. камітэт узаемадапамогі ў Рудакоўскім сельсавеце рабіў цэментныя трубы. Былы гаспадар гэтых труб у асобе **Пятрова** перадаў іх гр. вёскі Якушы **Паўлаву І.** на хаваньне. Гэтыя трубы ляжаць і зараз, многія з іх ужо пабіты, а яны патрэбны будаўніцтву.

РСІ павінна гэтым пытаньнем заняцца, трубы перадаць будаўніцтву, а тых, хто іх доўгі час хаваў, прыцягнуць да адказнасьці.

Рабкораўскае вока.

Пленум сэкцыі гарсавету

29 га ліпеня, а 7 гадз. увечары, адбудуцца пленумы сэкцый гарсавету:

Вайсковай—у Ялагінскім сельсавеце, збор на вуглу Бальнічнай вуліцы, а 6 гадз.

Адміністрацыйна-прававой— у памяшканьні пракуратуры (Замкавая № 24).

Сельскагаспадарчай—у доме «селяніна».

РСІ—у клюбе швэйнікаў.

Камунальнай—у клюбе камунальнікаў.

Працы і забясьпекі — у клюбе саматужнікаў.

Нарасьветы—у доме асьветы.

Аховы здароўя—у клюбе мэдсан працы.

Бытавой—у клюбе будаўнікоў.

Кааперацыйна-гандлёвай — у клюбе «Прафінтэрн».

Грашовай—у памяшканьні гарсавету, пакой № 22.

Прамысловай—у клюбе металістых.

Сёньня, 27-га ліпеня, будуць наступныя сходы па справаздачы гарсавету на ніжэйпамянёных прадпрыемствах:

Рабочых і служачых заводу **«Чырвоны Металіст»** у сталоўцы заводу, а 4 гадз., дакладчык—т. Вэнзель.

Рабочых і служачых **Саюзтрансу**, у клюбе транспартнікаў (Вакзальная № 20), а 7 гадз., дакладчык—т. Хвесюк.

Паседжаньне бюро скаргаў

28-га ліпеня, а 6-й гадзіне ўвечары, у памяшканьні РСІ (Замкавая, 26) адбудзецца паседжаньне бюро скаргаў РСІ з наступнай абвесткай дню:

1) Справа прадуктовага маг. 26-га куста. Выклікаюцца: заг. 26-га куста, заг. магаз. т. Малочнікаў, пай шчыча Іванова—жых. па 2-й Юр'еўскай № 23. (Дакл. т. Корзін).

2) Справа сталоўкі № 1. Выклікаюцца: заг. сталоўкі № 1, заг. буфэтам—т. Мініна, прад-ўшчыца буфэта т. Просекава, рабочы «Прагрэса» Яхнін, члены арц. «Уперад» Кісіна, Аксельрод, Мірская, Іоффе і інш.

3) Справа сталоўкі № 5. Выклікаюцца: заг. сталоўкі № 5, рабочы Шмей—жых. Аршанскае шасе 91, Гельдзіна ф-ка «Лекерта» і працаўнікі сталоўкі, прадстаўнік ЦРК гандлёвага аддзелу і грамадзкага харчаваньня.

4) Справа буфэта ТПО на вакзале 1-га кл. Выклікаюцца: заг. буфэта, рабочы кандуктар Дайхін, член гарсавету Лінда, повар Міхалоўскі, заг. стал. Масьлевьнікаў, прадстаўнік праўленьня ТПО чыг.

На гэта паседжаньне вылучаны заседацелямі раб. голкавай ф-кі Астроўскі і раб. ф-кі «Прагрэс» Бутырына. Запрашаюцца ўсе члены бюро скаргаў, дабрахвотнікі, «ЛК» і дэлегаткі жанадзелу.

Нарада па правядзеньні міжнароднага чырвонага дню

Заўтра, 28-га ліпеня, а 7 гадзіне ўвечары, у памяшканьні Палацу працы (пакой № 25), адбудзецца нарада старшынь саватароў ячэек Асоавіахэму, старшынь рэдкалегій шматражак і насьценгазэт, культпрацаўнікоў фабкомаў, сакратароў ячэек КСМ і ячэек т-ва «Прэч няпісьменнасьць» па пытаньні: 1) аб дэкадніку практычнай дапамогі грамадзянскай авіяцыі 2) аб міжнародным чырвоным дні 1-га жніўня і 3) аб дэкадніку штурму няпісьменнасьці.

Яўка вышэйпаказаных таварышоў абавязкова.

«Віцебскі Пралетары», Гарпрафсавет, ГК КСМ, гарсавет Асоавіахэму і гарсавет т-ва «Прэч няпісьменнасьць».

Падрыхтавацца да 1-га жніўня

Ня гледзячы на зусім канкрэтныя пастановы ЦК КП(б)Б і віцебскага гаркому партыі аб правядзеньні міжнароднага чырвонага дня—1-га жніўня,—на прадпрыемствах і ўстановах Віцебску ў гэтым напрамку нічога ня робіцца. Ні прафсаюзныя, ні камсамольскія, ні нават партыйныя арганізацыі на гэтую вялікарную палітычную кампанію яшчэ не зьвярнулі дастатковай увагі. Зусім нічога ня робяць дабрахвотныя таварыствы, як «Чырвоны крыж», МОПР, ОДР, Аўтадор, «Прэч няпісьменнасьць» і інш.

Дэкада дапамогі грамадзянскаму паветранаму флёту таксама праходзіць зусім дрэнна. Апрача паасобных прадпрыемстваў, увага шырокіх мас працоўных яшчэ не мабілізава на гэтую справу.

«Віцебскі Пралетары» заўтра, 29 ліпеня, склікае шырокую нараду па пытаньнях правядзеньня дня жніўня і дэкады дапамогі грамадзянскай авіяцыі.

Усе выкліканыя на гэтую нараду павінны зьявіцца з фактычнымі матарыяламі, адлюстроўваючымі работу па паказаных пытаньнях на кожным прадпрыемстве і па кожнай арганізацыі. Усе выкліканыя павінны зьявіцца абавязкова па пытаньні, якія стаяць на нарадзе надта важныя, каб не магчыма адмаўляцца ад вырашэньня іх з-за небудзь «аб'ектыўнымі» прычынамі.

М. Хаваме.

Пасяджэньне прэзыдыуму гарсавету на шчаціннай ф-цы

28-га ліпеня, а 7 гадз увечары, пасяджэньне прэзыдыуму гарсавету адбудзецца на шчаціннай ф-цы.

Абвестка дню:

Ход будаўніцтва шчаціннага камбінату і становішча жыльлё будаўніцтва камбінату.

Прэзыдыум зварачваецца да фабзаўмясцкомаў шчаціннай, шчотнай і валасапрадзільнай ф-к забясьпечыць яўку рабочых.

Да ведама чырвонагвардзей цаў і чырвоных партызан

1-га жніўня ўсе чырвонагвардзейцы і чырвоныя партызаны павінны сабрацца к 4 гадзінам дню ў гарсавеце для ўдзелу ў дэманстрацыі, прысьвечанай Міжнароднаму чырвонаму дню.

Яўка абавязковая ў формах.

Да ведама ячэек ЛКСМ

29-га ліпеня а 6-й гадзіне ўвечары, у памяшканьні ГК ЛКСМ адбудзецца нарада культпропу ячэек ЛКСМБ. Парадак дню: Аб 17 МК.

Яўка абавязкова.

ГК ЛКСМ.

—о—

— Заўтра, 28 ліпеня, а 6 гадзіне увечары, у памяшканьні гарсавету КП(б)Б (Замкавая 26) склікаецца нарада 3-кутнікаў цагельных заводаў г. Віцебску супольна з вораскім актывам па пытаньню пашыраньня цэглы.

ГарКК—Р

Нам. рэдактара **Н. Баруноў.**

БЕЛДЗЯРЖТЭАТР

Пач. а 8½ гадз. увеч.

ГАСТРОЛІ ЛЕНІНГРАДЗКАГА ТЭАТРУ ДРАМЫ І КАМЭДЫІ

Апошнія гастролі.

Сёньня, 27-га ліпеня,

ПРАДАУЦЫ СЛАВЫ

камэдыя ў 4-х дзеях з пралёгам.

Біл. прад. у касе тэат. з 12—2 і з 5 г.

ГАРТЭАТР

Сёньня, у панядзелак, 27-га і заўтра, у аўторак, 28-га ліпеня,

апошнія 2 гастролі

БАЛЕТА

дзяржтэатру опэры і балету (б. Марыінскі).

ЧЫТАЙЦЕ АФІШЫ.

БЕЛДЗЯРЖКІНО з панядзелка, 27-га ліпеня

СПАРТАК Пачатак 1-га сэансу а 7 г. — Толькі 3 дні: 27, 28 і 29 ліпеня, амэрыканскі фільм **Лагуна пэрлаў** у 8 частках.

МАСТАЦКІ Пачатак 1-га сэансу а 7 г. — Толькі 3 дні: 27, 28 і 29 ліпеня, новая замежная камэдыя **ХРЫЗАНТЭМА**

ПРАЛЕТКІНО Пачатак 1-га сэансу а 7 г. — Толькі 3 дні: 27, 28 і 29 ліпеня, **ЗЯЛЕНЫ ЗАВУЛАК**

ЧЫРВОНААРМЕЙСКІ КІНО-ТЭАТР

Толькі 1 дзень—сёньня, у панядзелак, 27-га ліпеня, нашумеўшы баявік

Залаты клюў

Пачатак 1-га сэансу а 1 гадз. 1022—2—2

ГАРТЭАТР ДАМЭЦ

АНОНС! КАНЦЭРТ АНОНС!

ВЯДОМАГА ВЫКАНАЎЦЫ НАРОДНАЙ ЯЎРЭЙСКАЙ ПЕСЬНІ

М. І.

Эпельбаума

1029—2—1

Друкарні „Камінтэрн" ПАТРАБУЮЦЦА

для кваліфікацыі на наборшчыкаў

падлеткі ад 18 год, маючыя адукацыю ня ніжэй 6—7 клясаў.

Жадаючыя могуць наведацца ў друкарні: Бальшавіцкая, 10, ад 8 гадз. раніцы да 5 гадз. дню.

Адміністрацыя.

РО КАРТОТЕКА ПО ОБМЕНУ РАЦИОНАЛЬНЫМ ОПЫТОМ РО

В управлении (института технического управления при НКРИ СССР)

ВЫШЛИ В СВЕТ

первые 50 карточек.

СРЕДИ НИХ:

1. Организация выдачи зарплаты через сберкассы (в крупных и мелких учреждениях и предприятиях).
2. Поточная система обработки бухгалтерских материалов.
3. Непрерывная выдача зарплаты.
4. Материальный учет в предприятиях.
5. Безналичные расчеты в закрытом распределителе.
6. Рациональный способ загрузки оборудования рабочей силой при непрерывке.
7. Нормирование труда работников сберкассы.
8. Организация сбора выручки и документов по торговой сети.
9. Учет рабочего времени на предприятиях.
10. Система расчетных чеков при цеховом хозрасчете и другие карточки, затрагивающие ряд актуальнейших вопросов хозяйственной, административной и общественной жизни.
11. Организация общественной инспектуры.
12. Практика соцсовместительства.

ИЗДАТЕЛЬСТВО ПРИСТУПИЛО К РАССЫЛКЕ ВЫШЕДШИХ КАРТОЧЕК ПОДПИСЧИКАМ

Подписка только на годовой комплект (600 карточек—60 руб) продолжается. Отдельные карточки не высылаются.

Картотека РО необходима: всем промышленным предприятиям, учреждениям, торговым, сельско-хозяйственным, административным, кооперативным и другим организациям: партийным, профессиональным и общественным.

Подробные проспекты высылаются по первому требованию.

Подписную плату направлять в Московскую областную контору госбанка контокор. сч. № 5311.

Заказы направлять: Москва, центральная Ильинка, Рыбный переулок, 2, пом. 28, издательство «Техника управления».

1019—1—1

Аб'ява

Згодна пастановы міжведамственнай нарады пры Саюзтрансе, **прапануецца ўсім установам і прадпрыемствам,** што заключылі дагавары з віцебскай канторай Саюзтрансу на вытварэньне транспартна-экспэдыцыйных апэрацый, у пяцідзённы тэрмін, **не пазьней 29-га ліпеня, представіць Саюзтрансу зьвесткі аб грузазвароце на перыяд восенна-зімовых перавозак,** г. зн. з 1-га жніўня па 31-га сьнежня г. г. паасобна за кожны месяц па прыбыцыі і адпраўленьні з пералічэньнем роду грузаў.

Установы і прадпрыемствы, якія не представяць паказаных вышэй зьвестак, **будуць пазбаўлены права карыстацца** нашым аўта-гужтранспартам на перыяд восенна-зімовых перавозак.

Кіраўнік віцебскай канторы Саюзтрансу **Рафаловіч.**

№ 1017—3—2

У аўторак, 28-га ліпеня, а 7 гадзін увечары, у клюбе «Мэдпрацаўнік», **адбудзецца**

2-ая ГАРАДЗКАЯ КАНФЭРЭНЦЫЯ ЧЫРВОНАГА КРЫЖУ

А 5-й гадзіне—фракцыя.

Мандаты выдаюцца ў к-це ДП, пакой № 34, ад 10 гадз. раніцы да 4-х гадз. дню.

Камітэт Чырвонага крыжу.

1025—3—2

Даводзіцца да ведама ўстаноў і насельніцтва г. Віцебску аб тым, што **КАМТРЭСТАМ вытвараецца продаж** за маёны разрахункам:

1) **Абанентных адрыўных білетаў па трамваю:** па намінальнай цане—10 кап. білет, без абмежаваньня колькасьці.

2) **Абанентных трамвайных картак** на розны час па цане: з уваходам праз пярэднюю пляцоўку—18 руб. у месяц, без права ўваходу праз пярэднюю пляцоўку—15 руб. у месяц.

3) **Абанементных адрыўных білетаў па лазьням** па намінальнай каштоўнасьці:

1-я кляса 30 кап.
2-я » 20 »

Ільготным тарыфам па вышэйпаказаным прадпрыемствам карыстаюцца:

ПА ТРАМВАЮ:

выключна рабочыя па сьпісах ФЗМК з паказаньнем адрасаў, з выдачай па 50 білетаў кожнаму на месяц, па цане 6 кап. білет.

ПА ЛАЗЬНЯМ:

Ваенвед, студэнцтва, атрымліваючае стыпэндыю і інваліды вайны прав страхкасу, па заяўкам арганізацый па цане:

1-я кляса 20 кап.
2-я » 10 »

Продаж усіх ільготных білетаў будзе вытварацца з 1-га па 10-е кожнага месяцу.

Продаж білетаў па намінальнай каштоўнасьці будзе вытварацца штодзённа з 10 гадз. раніцы да 4-х гадз. дню, за выключэньнем выходных дзён, у памяшканьні к-ры Віцкамтрэсту (пляц Волі, 1/2).

ВІЦКАМТРЭСТ.

984—5—2

ВІЦЕБСКІ ВЯЧЭРНІ РАБОЧЫ УНІВЭРСЫТЭТ

Адчыкен восенны прыём на 1-ы курс універсытэту. Прымаюцца выключна рабочыя з фабрычна-завадзкіх прадпрыемстваў з 3-гадовым рабочым стажам, першапачатковай адукацыяй (2—3 першыя групы школы, ці хатняя самаадукацыя).

Заявы прымаюцца да 25 га жніўня г. г., у канцэлярыі ўніверсытэту (Валадарская вул., д. № 27/6), у памяшканьні **мааперацыйнага тэхнікуму, 2-гі паверх, пакой № 4,** штодзённа (за выключэньнем выходных дзён: 5, 10, 15, 20, 25 і 30), з 6 да 8 гадз. увеч.

К заявам неабходна прылажыць наступныя дакуманты:

а) Пасьведчаньне з месца працы і папярэднім рабочым стажам.

б) Даведка аб сацыяльным становішчы бацькоў.

в) Анкета, засьведчаная фабзаўкомам.

Анкеты і даведкі аб паступленьні магчыма атрымаць у канцэлярыі універсытэту.

Курс навучаньня 2½ гады (5 сяместраў).

З 1-га курсу, апрача агульна-адукацыйных дысцыплін, пачынаецца разьбіўка на цыклы па спэцыяльнасьцям. Намячаюцца наступныя цыклы: 1) мэханічны, 2) электра-тэхнічны, 3) адміністрацыйна-гаспадарчы, 4) каапэрацыйны і 5) прафрух.

Заўтра, у аўторак, 28 га ліпеня, а 8-й гадзіне увечары, у гарклюбе **лесдрэўрабочых** адбудзецца **вялікі вытворчы вечар-пераклічка** па выкананьню прамфінпляну за 2-і квартал 1931 г. лесзаводу № 13, фанэрнага заводу, інструмэнтальна-мэблёвай ф-кі, ф-кі гнутай мэблі, лесзаводу № 3, кіраўніцтва па сплаву і Віцлеспрамгасу.

На абвестцы дню: **выкананьне прамфінпляну за 2-і квартал** і што зроблена па прамове т. Сталіна.

Садаклады аб ударніцтве і сац. саборніцтве.

ФЗМК павінны прыняць захады да 100% яўкі рабочых на гэты вечар.

Прадпрыемства, маючае лепшыя паказальнікі выкананьня прамфінпляну, **атрымоўвае сьцяг—прыз пераходны.**

Пасьля вечару—**вялікая мастацкая частка.**

1030—2—1 **Клюбны арганізатар.**

Гр. Сойкін Сяргей Васільевіч 1901 г. нарадж. урадж. г. Віцебску, служыць тэлеграфістам пры ст. Віцебск МБВ чыгункі, жыхар. па вул. Чычэрына, № 41|7, **мяняе прозьвішча Сойкін на Вронскі.**

Асобы і ўстановы, маючыя перашкоду, паведаміць ЗАГС, пакой № 6 (Гарсавет), на працягу 2-х тыдняў.

1024—1—1 Загадчык ЗАГС'у **Левін.**

Віцебскі вэтэрынарны інстытут ПРАДАЕ ЛЁКАМАБІЛЬ

8 конскіх сіл, у спраўным відзе.

За ўмовамі зварочвацца да дырэкцыі вэтінстытуту.

1031—1—1

Кошт публікацыі аб згубе аднаго дакуманту 1 руб.

МЯНЯЮ КВАТЭРУ ў Віцебску з усімі ўдобствамі, у цэнтры горада **на такую-ж кватэру ў Менску.** З прапановамі зварочвацца: Менск, Школьная, д. № 6, кв. Казінік. 961—6—

Згублены і ўкрадзены ніжэйпаказаныя дакументы, якія лічыць несапраўднымі:

Па гораду:

Паяв. прамтав. прадукт. наб. ліст. і ўкл. ЦРК А. С. Кухарвай
Вайсковы білет П. П. Яблакава
Вайсков. кн. А. С. Шамшура
Мэтрыка № 12008 Н. В. Лейко
Член. білет саюзу саўгандсл. № 2549 Г. Т. Прудзікава
Пасьв. асабов. 307 і прыг. білет № 180558 А. Е. Кавалёва
Сэзон. прадукт. катрка А. Е. Кавалёва

Віцгарліт № 1. Друкарня «Камінтэрн», Бальшавіцкая, 10. Тыраж 10.000